◂ № 38 (261) ◂ 14 кастрычніка ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**УЛАДЗІМІР НЯКЛЯЕЎ**

Стар. 14–15

**ПРА СВАБОДУ І БУЛЬБЯНЫЯ АБІРКІ**

Эканамічны крызіс, які накрыў Беларусь, — толькі водгук крызісу грамадства, яго неканкурэнтаздольнасці

Стар. 4

**СПАБОРНІЧАЮЦЬ З СОНЦАМ**

Нават самая прымітыўная эканоміка існуе дзеля таго, каб зарабляць болей, чым выдаткоўваць. Увогуле, яна з гэтага і пачынаецца. А што тады сказаць пра нашу?..

Стар. 5

**ЧАМУ МАЎЧАЦЬ УКРАІНЦЫ?**

Стар. 13

ISSN 2218-2144

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ: ПАЧАТАК**

Нарыс Алега Новікава з цыклу «Узгадаць усё»

З НАГОДЫ

# ЛЮБЯЦЬ, НЕ ЛЮБЯЦЬ…

Вольга ХВОІН

**Масавая акцыя пратэсту, якую планавалі на восень, Народны сход, прадэманстравала апатыю, страх грамадства і старыя граблі апазіцыі — раз'яднанасць і немагчымасць супрацьстаяць дзяржаўнай сістэме. А дзяржаўная сістэма стаіць на моцных гліняных нагах калоса, і выглядае на тое, што гатовая сысці ў «нязнанку» ў спадзеве перачакаць смутны час.**




У рэгіёнах Народны сход сабраў дзясяткі чалавек, у сталіцы — блізу тысячы. Акцыі праходзілі з патрабаваннем вызвалення палітвязняў і правядзення свабодных і сумленных выбараў і адначасова — з патрабаваннем спыніць рост цэн, індэксаваць зарплаты і пенсіі.

Чаму ва ўмовах эканамічнага крызісу грамадства так аморфна паставілася да пратэстнай акцыі? Гэта бадай што самае цікавае пытанне. Тым больш, што цяпер не можна весці размову пра стабілізацыю сітуацыі, узровень даходаў і дабрабыту па-ранейшаму коціцца ўніз.

Так, па выніках таргоў на дадатковай сесіі Беларускай валютнафондавай біржы, беларускі рубель ужо тыдзень падае. У сераду, 12 кастрычніка, курс долара падскочыў да 8710 рублёў і абышоў узровень, на якім адкрывалася дадатковая сесія ў верасні. Індэкс цэн на харчовыя тавары ў верасні 2011 года ў параўнанні са жніўнем 2011 года склаў 118,6 %, са снежнем 2010 года — 184,2 %, паведамляе Белстат.

Палітолаг Аляксей Пікулік мяркуе, што, як бы ні парадаксальна гэта гучала, але намёкаў на сацыяльны выбух у беларускім грамадстве няма. «Нягледзячы на тое, што рэйтынг Лукашэнкі цяпер не большы за 20–25 працэнтаў, улада даволі стабільная, устойлівая. Яна, канешне, слабейшая, чым калі б тое ні было, але і апазіцыя слабая. Лукашэнку моцна пашанцавала з народам. Зладзіць 190-працэнтную дэвальвацыю нацыянальнай валюты на працягу дзесяці месяцаў і пры гэтым не пабачыць фактычна ніводнай вялікай забастоўкі — ніхто нікуды не пайшоў, новыя лідары галоднага працоўнага класа не сфарміраваліся, сяляне з віламі ў гарады не прыехалі, — канстатуе эксперт. — Запас трываласці ў беларусаў вялікі, сямнаццаць гадоў пры Лукашэнку, кажуць, жылося някепска. І не думаю, што ўладзе ёсць сур'ёзная пагроза, што галодныя масы змятуць рэжым».

Пакуль беларусы на кухнях — і толькі! — клянуць дзяржаву за ўласную галечу, гэта самая дзяржава спрабуе знайсці знешнія сродкі, каб утрымацца на плыву. Да слова, Беларусі патрэбныя немалыя рэсурсы не толькі на затыканне бюджэтных дзірак, але і на выплату пазыкаў, аб'ём якіх цягам апошніх гадоў вырас як на свежых дражджах. На пачатку кастрычніка Міжнародны валютны фонд у сувязі з дэвальвацыяй беларускага рубля ў 2011 годзе пераацаніў дзяржаўную пазыку Беларусі з 35,6 % да 46,3 % ад ВУП. Кароткатэрміновыя даўгі банкаў і прадпрыемстваў цяпер больш за 30 працэнтаў ад ВУП. А ўнутраны валавы прадукт Беларусі па стане на 2010 год крыху не дацягваў да 55 мільярдаў долараў.

У кастрычніку ў Беларусі працуе місія Міжнароднага валютнага фонду з мэтай ацаніць эканамічную сітуацыю ў краіне. Ва ўрадзе не выключаюць, што ў рамках працы місіі гаворка можа пайсці пра фарміраванне новай праграмы МВФ для Беларусі, то бок крэдытаванне. Міністр фінансаў Беларусі Андрэй Харкавец заявіў, што крэдыт Міжнароднага валютнага фонду патрэбен Мінску, перш за ўсё, для аднаўлення пазітыўнага стаўлення інвестараў да эканамічнай палітыкі ўладаў.

Пра магчымую фінансавую дапамогу Беларусі, нягледзячы на ўсе дэмаршы афіцыйнага Мінска ў часе саміта «Усходняга партнёрства», неаднаразова заяўляў прэм'ер-міністр Польшчы Дональд Туск. У прыватнасці, ён сказаў, што Еўрасаюз гатовы прадставіць Беларусі да 9 мільярдаў долараў у абмен на выкананне пэўных умоў, што тычацца правоў чалавека, дэмакратычных свабодаў і свабодных выбараў. Шэраг аналітыкаў мяркуюць, што агучванне гэтай інфармацыі можна расцэньваць хутчэй як пасыл да наменклатуры Беларусі, маўляў, у крызісныя часы пераменаў вы сам-насам не застанецеся. Хаця пакуль гаварыць аб тым, што сістэма страціла кіруемасць, не выпадае.

Палітолаг Аляксей Пікулік падкрэслівае, што, нягледзячы на разрыў адносінаў з Еўрасаюзам, Аляксандр Лукашэнка ўсё адно выйшаў пераможцам. І гэта ва ўмовах, калі ў краіне былі дзясяткі палітвязняў. «Трэба прызнаць, што ён выйграў гульню, распачатую ў снежні, учыстую. Пытанне, легітымны прэзідэнт Лукашэнка ці не, ужо і не стаіць. Сумневы ў легітымнасці ён вырашыў тым, што пачаў кашмарыць апазіцыю. Палітвязняў патрымалі, і выпусцяць у выпадку, калі паверацць, што Еўропа насамрэч гатовая дапамагчы грашыма», — гаворыць палітолаг.

Варта згадаць, што ў шэрагу інструментаў, якія маглі б дапамагчы Беларусі выбрацца з крызісу, найперш называюць структурныя рэформы эканомікі. Але пакуль пра гэта не вядзецца размова. Ёсць паўзучая прыватызацыя, рост цэн, падзенне пакупной здольнасці спажыўцоў, нарастанне знешняй запазычанасці і ўсё тое ж ручное кіраванне эканамічнай мадэллю.

У цяперашніх умовах перамены і трансфармацыя дзяржаўнай сістэмы Беларусі найперш звязаныя з палітычнай воляй яе лідара. Але ці ёсць гэтая воля? Тут можна прывесці словы Аляксандра Лукашэнкі, сказаныя падчас прэсавай канферэнцыі з расійскімі журналістамі.

«Калі б я быў толькі ўпэўнены і ведаў, што беларусы на 80 працэнтаў, ці там больш, ненавідзяць Лукашэнку, я б усе гэтыя шмоткі сабраў, паклаў на стол і сказаў: дзякуй, браткі-беларусы. Я сабе на хлеб зараблю, — заявіў ён. — Я не трымаюся за гэтае крэсла, як вы часам пішаце ў Расіі: дзеля ўлады або дзеля багацця і грошай». Каментуючы вынікі незалежных сацапытанняў, якія сведчаць пра падзенне яго рэйтынгаў, Лукашэнка назваў гэта «поўнай хлуснёй». Ён упэўнены, што беларусы павінны яго «любіць». «А за што не любяць? Ну, скажыце, за што? Што, я горш за іншых працую? Не. Не любіць жа трэба за нешта», — заявіў кіраўнік Беларусі.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ПАЛІТВЯЗНІ: 11+3

Вольга ХВОІН

**Праваабарончы цэнтр «Вясна» і Беларускі хельсінкскі камітэт прызналі Ігара Аліневіча, Мікалая Дзядка, Аляксандра Францкевіча палітычнымі зняволенымі дзеючага ў Беларусі рэжыму.**

У выніку цяперашні спіс палітвязняў Беларусі выглядае так: «11+3». Гэта значыць, што палітычная матываванасць прысудаў 11 асобаў не выклікае пытанняў у прадстаўнікоў праваабарончых арганізацый і палітыкаў. Справы трох чалавек будуць дадаткова даследавацца.

У асноўнымі спісе палітвязняў — Статкевіч, Саннікаў, Бандарэнка, Аўтуховіч, Бяляцкі, Севярынец, Дашкевіч, Лобаў, Аліневіч, Дзядок, Францкевіч. Што тычыцца трох апошніх прозвішчаў, то ў спіс палітвязняў гэтых асобаў праваабаронцы дадалі пасля аналізу іх крымінальных спраў. Паводле заключэння БХК, такое рашэнне грунтуецца на падставе таго, што папярэдняе следства па крымінальнай справе суправаджалася сур'ёзнымі працэсуальнымі парушэннямі, у тым ліку правоў асуджаных. У часе судовага працэсу парушаўся прынцып роўнасці бакоў па прадстаўленні доказаў. Грубыя парушэнні правоў асуджаных даюць падставу сцвярджаць, што разгляд справы ў судзе не быў аб'ектыўным, поўным і ўсебаковым, а вынесены прысуд — неабгрунтаваны і незаконны. Змяшчэнне пад варту І. Аліневіча, М. Дзядка, А. Францкевіча, іх асуджэнне да такіх доўгіх, відавочна неадэкватных тэрмінаў пазбаўлення волі, пры несправядлівым разглядзе, «відавочным чынам звязана з палітычнымі матывамі ўладаў».

Трое фігурантаў «бабруйскай справы анархістаў» (Яўген Васьковіч, Павел Сырамалотаў, Арцём Пракапенка) былі асуджаныя за падпал будынку Бабруйскага КДБ на сем гадоў пазбаўлення волі. Іх прызналі вінаватымі па двух артыкулах крымінальнага кодэксу: «злоснае хуліганства» і «наўмыснае прычыненне шкоды ў асабліва буйных памерах». Нанесеная матэрыяльная шкода была ацэненая ў 235 тысяч рублёў. Хаця прысуды былі вынесеныя ў маі, праваабаронцы да гэтага часу не мелі магчымасці азнаёміцца з усімі даступнымі афіцыйнымі матэрыяламі судовага працэсу і следства.

Юрыст праваабарончага цэнтру «Вясна» Валянцін Стэфановіч гаворыць, што «бабруйская справа анархістаў» шмат у чым пераклікаецца са справаю аб падзеях 19 снежня 2010 года. У прыватнасці, ацэнку дзеянням цяпер ужо асуджаных улады зрабілі яшчэ да вынясення прысуду, што і было агучана праз дзяржаўныя СМІ, ёсць праблема юрыдычнай кваліфікацыі дзеянняў асуджаных. Да ўсяго, асуджаныя юнакі з руху анархістаў падчас суда заяўлялі, што свае паказанні давалі пад ціскам следчых органаў. Бліжэйшым часам праваабарончыя арганізацыі маюць намер правесці аналіз згаданых крымінальных спраў і вынесці свой вердыкт наконт іх палітычнай матываванасці.

Спіс палітвязняў па названай формуле «11+3» быў адпраўлены чыноўнікам ЕС і ў еўрапейскія афіцыйныя структуры.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ЗАБАРАНІЛІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ СЦЯГ

**Беларускія заўзятары не маюць права ўжываць нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг на міжнародных спартыўных мерапрыемствах у Польшчы.**

Гэта вынікае з адказу польскай пракуратуры на заяву аб здзяйсненні злачынства ў дачыненні да групы беларускіх баскетбольных заўзятараў на матчы Беларусь—Літва ў польскім Быдгашчы.

Заява ў польскую пракуратуру паступіла ад беларускага заўзятара Ігара Шчэкарэвіча.

Паводле супрацоўнікаў польскай пракуратуры, бел-чырвона-белы сцяг «не з'яўляецца абавязковым нацыянальным сцягам Беларусі». Таму беларускія заўзятары не мелі права ўжываць яго на матчы.

Адмову Шчэкарэвіча выйсці з залі польская пракуратура трактавала як «актыўны супраціў». Таму супрацоўнікі аховы нічога не парушылі, калі ўжылі супраць Шчэкарэвіча сілу. Сам Шчэкарэвіч не здзіўлены такім адказам польскай пракуратуры.

«Так, у мяне такі адказ не выклікае здзіўлення. Яго я атрымаў ад польскай пракуратуры, якая, на маё меркаванне, матэнакіравана выдала Беларусі банкаўскія звесткі Алеся Бяляцкага. Гэта тая самая пракуратуры, якая ўжо 12 гадоў займаецца пераследам палітычнага ўцекача Андрэя Жукаўца. Думаю, у польскай пракуратуры яшчэ шмат «беларускіх шкілетаў» у шафе. У бліжэйшы час я пракансультуюся з кіраўніцтвам Цэнтра «Супрацоўніцтва без межаў» і вырашу, якія крокі мы прымем у гэтай справе далей», — распавёў Ігар.

Нагадаем, што інцыдэнт адбыўся 25 чэрвеня 2011 года на матчы чэмпіянату Еўропы па баскетболе сярод жанчын у польскім Быдгашчы. Беларускі тады гулялі з літоўкамі. Служба аховы стадыёну, дзе праходзіла гульня, перашкаджала групе беларускіх заўзятараў разгарнуць бел-чырвона-белыя сцягі, а пасля даволі груба выдаліла беларусаў са стадыёну.

**Прэс-служба Цэнтра «Супрацоўніцтва без межаў»**

ПРЫСУД

# ТРЫ ГАДЫ АПОШНЯМУ «ДЗЕКАБРЫСТУ»

Генадзь КЕСНЕР

**Суд Маскоўскага раёна Мінска 12 кастрычніка прыгаварыў удзельніка падзей 19 снежня 2010 года ў беларускай сталіцы Святаслава Барановіча да трох гадоў абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Такое рашэнне ў сераду прыняла суддзя Алена Рудніцкая.**

25-гадовы Святаслаў Барановіч працуе будаўніком у Мінску, сам ён паходзіць з Вілейкі. Маладому чалавеку, якога абвінавачвалі ў актыўным удзеле ў масавых беспарадках, пагражала да васьмі гадоў пазбаўлення волі. У судовым працэсе прымалі ўдзел тыя ж самыя супрацоўнікі праваахоўных органаў, якія праходзілі ў якасці пацярпелых падчас шматлікіх судовых працэсаў па падзеях 19 снежня на пачатку бягучага года. Як і на тых судовых пасяджэннях, «пацярпелыя» спецназаўцы не пазналі Барановіча як асобу, што наносіла ім фізічны ўрон ці чыніла пагром Дома ўраду.

Як адзначыў у сваім выступе адвакат Барановіча, удзел яго падабароннага ў падзеях на плошчы Незалежнасці ў Мінску не адпавядае артыкулу Крымінальнага кодэкса аб масавых беспарадках. Пракурор пагадзіўся толькі з тым довадам, што ўдзел абвінавачанага ў падзеях 19 снежня 2010 года быў сапраўды малы. Таму вырак быў не самы жорсткі — тры гады «хатняй хіміі». З Святаслава Барановіча ўзялі падпіску аб нявыездзе.

Палітолаг Валеры Карбалевіч лічыць, што вынясенне чаргавага абвінаваўчага прысуду па падзеях на «Плошчы» сведчыць пра чарговыя палітычныя замаразкі ў Беларусі. «Гэта пацвярджае і гэты прысуд, і ўзмацненне прэсінгу ў дачыненні да тых палітвязняў, якія і сёння сядзяць у вязніцах, і ўзмацненне канфлікту з Еўрапейскім саюзам. Беларускія ўлады вырашылі прадэманстраваць Еўрасаюзу, які не пажадаў пайсці на нейкія саступкі кіраўніцтву Беларусі, што калі той не хоча па-добраму, то афіцыйны Мінск можа дзейнічаць і па-кепскаму. Такія дзеянні ўладаў ёсць канстатацыяй такога трэнду ў паводзінах кіраўніцтва нашай краіны», — адзначыў эксперт.

Цяпер, згодна з дзеючым заканадаўствам, Святаслаў Барановіч мусіць стаць на ўлік у крымінальна-выканаўчай інспекцыі, ён павінен паведамляць інспекцыі, калі будзе ўладкоўвацца на новую працу ці месца вучобы. Барановіч не мае права мяняць месца жыхарства, пакідаць межы населенага пункта без дазволу адпаведных службаў. Ад 19.00 да 6.00 малады чалавек павінен знаходзіцца дома.

ПАДТРЫМКА

# ШЭСЦЕ АДБУДЗЕЦЦА

**Брэсцкі гарвыканкам адмовіў праваабаронцу, актывісту Руху «За Свабоду» Раману Кісляку ў правядзенні шэсця супраць незаконнага ўтрымання пад вартай Алеся Бяляцкага**

Кісляк падаваў заяўку на адзіночнае вулічнае шэсце 16 кастрычніка на пешаходнай частцы бульвара Касманаўтаў. Мэта акцыі — прыцягнуць увагу жыхароў горада да факту парушэння права на свабоду віцэ-прэзідэнта Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека, кіраўніка закрытага ўладамі праваабарончага цэнтра «Вясна».

«У адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 9 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах пасля затрымання Бяляцкага павінны былі ў тэрміновым парадку даставіць да суддзі, і той павінен прымаць рашэнне або аб арышце, або аб вызваленні затрыманага пад заклад ці іншае абавязацельства. Гэта норма пакта з'яўляецца часткай дзейнага на тэрыторыі Беларусі заканадаўства і падлягае непасрэднаму прымяненню, — сказаў Кісляк. — Наколькі мне вядома, Бяляцкі не быў дастаўлены для гэтага ў суд. Яго ўтрыманне пад вартай звыш 48 гадзін з'яўляецца незаконным і парушае яго правы на свабоду і асабістую недатыкальнасць. Пра гэта я хацеў з дапамогай мегафона інфармаваць жыхароў Брэста падчас вулічнага шэсця».

Кісляку адмоўлена ў шэсці на падставе таго, што да заявы не прыкладзены дагаворы з органамі ўнутраных спраў, установай аховы здароўя і камунальным прадпрыемствам. «Гэта не адказ па сутнасці. На падставе Закона «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь» мне павінны «дазволіць» або «забараніць» правядзенне шэсця. Гэты закон тэрміну «адмовіць у правядзенні» не ўтрымлівае, — заявіў праваабаронца. — З такой фармулёўкай я атрымліваю адказ на сваю другую заяўленую акцыю, таму маю намер напісаць скаргу генеральнаму пракурору з патрабаваннем правесці праверку дзейнасці мясцовых органаў улады па выдачы дазволаў на масавыя мерапрыемствы, а таксама арганізаваць навучанне супрацоўнікаў Брэсцкага гарвыканкама выкананню закона аб масавых мерапрыемствах».

Як падкрэсліў праваабаронца, паколькі ён не атрымаў адказ у адпаведнасці з законам аб забароне вулічнага шэсця, то мае намер яго правесці.

«Я свае абавязкі выканаў: папярэдзіў мясцовыя ўлады пра акцыю», — сказаў Кісляк.

**Паводле інфармацыі Руху «За Свабоду»**

ІНІЦЫЯТЫВА

# СТАЛІЧНЫ РЭФЕРЭНДУМ

Вольга Хвоін

**Абаронцы сталічнага Севастопальскага парку хочуць ініцыяваць рэферэндум, каб захаваць зялёную зону ў цэнтры горада.**

Севастопальскі парк — зялёны масіў плошчай 73,16 гектара ў Першамайскім раёне Мінска. У ім месцяцца 8 артэзіянскіх свідравінаў, якія могуць забяспечваць да 500 000 жыхароў сталіцы якаснай пітной вадой.

Ва ўмовах вялікага горада Севастопальскі парк — гэта не толькі месца прагулак і адпачынку мясцовых жыхароў, але і «лёгкія раёна», гарант экалагічнай бяспекі, — адзначаюць спецыялісты. Ад 1996 года было здзейснена некалькі спробаў забудовы Севастопальскага парку. Органы дзяржаўнай улады, па словах мясцовых жыхароў, якія адстойваюць парк, даюць супярэчлівую і няпоўную інфармацыю аб стане свідравінаў, што дае падставы для сумневаў у іх рабоце. Згодна генеральнаму плану забудовы Мінска, праз тэрыторыю парку меркавалася правесці «3-е кальцо» аўтадарогі. Але пасля пратэстаў мясцовых жыхароў гэтае рашэнне адкладзена да 2020 года. Калі дарога будзе пабудаваная, то мясцы будуць ліквідаваныя свідравіны, а сам парк пазбаўлены статусу водаахоўнай і ландшафтна-рэкрэацыйнай зоны. Гэта дасць легальныя падставы для яго далейшай забудовы.

У кантэксце гэтых праблем быў праведзены круглы стол са спецыялістамі і жыхарамі прылеглых да парку вуліц. Удзельнікі круглага стала заклікаюць гарадскія ўлады ўлічваць грамадскае меркаванне пры прыняцці рашэнняў адносна Севастопальскага парка і іншых зялёных насаджэнняў у Першамайскім раёне Мінска. Адзіным выйсцем для вырашэння спрэчак вакол Севастопальскага парку і свідравінаў з вадой жыхары бачаць правядзенне мясцовага рэферэндуму, на які будуць вынесеныя пытанні пра лёс парку.

Віктар Янчурэвіч, лідар «Еўрапейскай перспектывы», адзначае: «Мясцовыя жыхары, даведзеныя да адчаю, не бачаць іншага выйсця, як вырашыць вострае пытанне праз раённы рэферэндум. Гэтае патрабаванне абгрунтаванае, і наша задача — спрыяць грамадзянам у рэалізацыі іх законных патрабаванняў».

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ДАБРАБЫТ ПРАЗ СПАГНАННІ

Генадзь КЕСНЕР



**Тое, што адбываецца ў Беларусі, не дае сумаваць ні журналістам, ні шараговым грамадзянам. Не паспелі прагучаць заявы галоўнага палітыка краіны пра заклапочанасць падзеннем амерыканскай ды еўрапейскай грашовых адзінак, як долар і еўра ўзляцелі на нязведаныя раней вышыні. А тым часам улады хочуць спагнаць з апазіцыйнай партыі грошы за быццам бы пашкоджаны офіс.**

Мінулая серада стала рэкорднай, што да курсу заходніх валют да беларускага рубля. Нават нягледзячы на інтэрвенцыю Нацыянальнага банка ў памеры 22 мільёнаў долараў падчас другой (дадатковай) сесіі Беларускай валютна-фондавай біржы, курс долара склаў 8710 рублёў, што на 110 рублёў перавысіла курс самых першых таргоў на другой сесіі БВФБ 14 верасня, а курс еўра ўзняўся да 12010 беларускіх рублёў. Расійскі ж рубель пацягнуў у сераду на 276 беларускіх.

Як з гэтай нагоды не ўзгадаць нядаўнія заявы кіраўніка дзяржавы, калі на некалькіх дадатковых сесіях БВФБ замежныя валюты дзіўным чынам гублялі ў вазе, пра яго заклапочанасць лёсам еўра і долара! Маўляў, Ермаковай (кіраўніцы Нацбанку) і Мясніковічу (прэм'ер-міністру) яшчэ трэба папрацаваць, каб долар не абрынуўся! Ага, зараз! Напрацавалі…

На пяцігадзіннай прэс-канферэнцыі для расійскіх рэгіянальных журналістаў 7 кастрычніка Аляксандр Лукашэнка заяўляў, што ў нашай краіне былі цяжкасці, але зараз сітуацыя стабілізавалася. І вось не прайшло і тыдня — атрымайце, панове! Эканоміка чарговым разам пацвердзіла, што гучным заявам ды дырэктывам яна не падпарадкоўваецца. На думку вядомых эканамістаў, гэта яшчэ не мяжа. Кіраўнік Аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Леанід Заіка прагназуе, што пры захаванні такога трэнду, асабліва пасля павышэння на 28% тарыфнай стаўкі першага разраду, курс долара да канца бягучага года можа скласці каля 11 тысяч беларускіх рублёў. А былы кіраўнік Нацбанку Станіслаў Багданкевіч лічыць, што пры правядзенні далей цяперашняй эканамічнай палітыкі ўрадам і рэгулятарам курс долара можа дасягнуць і 12 тысяч рублёў. Вось цікава, колькі ў пераліку на валюту будуць складаць заробкі, пенсіі і стыпендыі нават пасля іх абяцанага павелічэння?

Там часам, 12 кастрычніка ў новы офіс Партыі БНФ на вуліцы Крапоткіна наведаўся ўчастковы інспектар Савецкага РУУС і запатрабаваў тлумачэнняў наконт скаргі ЖРЭА, якая вырашыла спагнаць з апазіцыянераў 19 мільёнаў рублёў. Паводле эксплуатацыйнікаў, Партыя БНФ пры высяленні са свайго папярэдняга офісу на Машэрава, 8 наўмысна пашкодзіла маёмасць. Як заявіў участковы, такая сума можа падпадаць пад дзеянне артыкула Крымінальнага кодэкса Беларусі і можа пацягнуць распачацце крымінальнай справы. Маўляў, у каштарысе ЖРЭА гаворыцца пра дэмантаваныя дзверы, пашкоджаныя сцены, вокны, свяцільнікі і гэтак далей.

Па словах старшыні Партыі БНФ Аляксея Янукевіча, сума ў 19 мільёнаў рублёў «нерэальная і фантастычная». Янукевіч сцвярджае, што ніякай шкоды памяшканню не наносілася, наадварот, сядзіба захоўвалася ў вельмі добрым стане. Арандатары неаднойчы праводзілі рамонт, усталявалі імпартную сантэхніку. Такім чынам, на думку палітыка, ЖРЭА спрабуе атрымаць дадатковыя сродкі. Толькі вось хочацца прыгадаць і тое, колькі разоў невядомыя вандалы псавалі дзверы, білі шыбы падчас знаходжання Партыі БНФ у офісе на Машэрава, 8. І нешта не прыгадваецца, каб ці то ЖРЭА, ці то міліцыя знайшлі зламыснікаў і каб нехта кампенсаваў партыйцам выдаткі на рамонт пасля такіх нападаў. То бок, фінансавая плынь, нават самая малая, мусіць быць толькі ў адным накірунку — дзяржаўным.

А вось больш буйную фінансавую плынь, хоць і не наўпроставую, можна будзе чакаць з боку Расіі, якая выказала гатоўнасць прафінансаваць 90% работ па кантракту будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі на Астравеччыне. Пра гэта 13 кастрычніка журналістам паведаміў намеснік міністра энергетыкі Беларусі Міхаіл Міхадзюк. У дадзеным выпадку гаворка ідзе пра расійскі дзяржаўны экспартны крэдыт. Па словах Міхадзюка, «крэдытнае пагадненне знаходзіцца ў высокай ступені гатоўнасці». «Засталіся толькі невялікія кансультацыі па асобных момантах на ўзроўні экспертаў, і пагадненне будзе накіравана на ўнутрыдзяржаўныя працэдуры як у Расіі, так і ў Беларусі, бо гэта міжурадавае пагадненне», — адзначыў намеснік міністра энергетыкі.

Паводле чыноўніка, у аб'ём кантрактных абавязацельстваў з расійскага боку ўваходзіць будаўніцтва неабходнай інфраструктуры для АЭС. Дарэчы, як прызнаў ён, будаўніцтва жылля не ўваходзіць у аб'ём абавязацельстваў расійскага боку.

І вось тут узнікае пытанне: ці знойдуцца грошы на гэтае будаўніцтва ў беларускага боку? Гэта ў той час, калі банкі спыняюць ільготнае крэдытаванне жыллёвага будаўніцтва, а яго тэмпы зніжаюцца па зразумелых прычынах.

Разам з тым, будаўніцтва атамнай станцыі ў Гродзенскай вобласці можа зрабіць яшчэ больш напружанымі стасункі паміж Беларуссю і нашымі суседзямі з Еўрасаюза. Напрыклад, Вільнюс лічыць выбар пляцоўкі для размяшчэння Беларускай АЭС палітычна матываваным. «Мы вельмі б прасілі беларускія ўлады не ўводзіць у зман не толькі беларускі народ, але і ўсю сусветную супольнасць, — заявіў журналістам 12 кастрычніка пасол Літвы ў Беларусі Эдмінас Багдонас. — Выбар пляцоўкі не дасць ніякіх перспектыў супрацоўніцтва ў энергетычнай сферы з Літвой».

Дыпламат нагадаў, што 11 кастрычніка першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў Беларусі Віталь Кулік заявіў беларускім журналістам, што пазіцыя Літвы, якая выступае супраць будаўніцтва АЭС у Гродзенскай вобласці, ёсць палітычна матываванай. Кулік таксама заявіў, што Беларусь правяла з Літвой усе працэдуры па абмеркаванню справаздачы аб Ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе (АУНА) будучай АЭС. «Заява першага віцэ-міністра Куліка Літва лічыць заведама не адпавядаючай ніякім стандартам дыпламатычных норм і заведама лжывай, бо Літва шматкроць заяўляла, што так званыя грамадскія слуханні ў Вільнюсе лічацца не адбытымі. Ніякіх кансультацый, мы лічым, таксама не адбылося», — падкрэсліў Эдмінас Багдонас. З яго слоў, Літва накіравала скаргу ў МАГАТЭ аб тым, што «справаздачы аб АУНА не было». Па словах літоўскага пасла, «і ў Жэневе, і ў Брусэлі Беларусь будзе павінна адказаць на многія і многія пытанні».

Пасля выпадаў на адрас Польшчы з боку кіраўніка беларускай дзяржавы абвастрэнне адносін з Літвой можа стаць сімвалічным, бо менавіта літоўскае кіраўніцтва, нават у асобе прэзідэнта гэтай краіны, працяглы час выступала адвакатам беларускіх уладаў на міжнароднай арэне. Цяпер афіцыйны Мінск можа наступіць на «атамныя граблі» і канчаткова пазбавіцца сваіх абаронцаў у лагеры краін-удзельніц Еўрапейскага саюза.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ВІКТОРЫЯ АЗАРАНКА



Беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка патрапіла ў спіс самых сэксуальных жанчын, якія цяпер жывуць на зямлі, паводле версіі часопіса «Esquire». Першае і бясспрэчнае месца гэтага рэйтынгу заняла цемнаскурая спявачка Рыяна. «Esquire» публікуе свой спіс самых сэксуальных жанчын «па стане на 2011 год» у лістападаўскім нумары. Пяць з пятнаццаці або нарадзіліся ў СССР, альбо выраслі ў сем'ях былых савецкіх грамадзян. Апроч Вікторыі Азаранкі ў ТОП-15 увайшлі Эма Стоўн — зорка амерыканскага камедыйнага кіно, якая нядаўна заявіла, што бацька забіў бы яе, калі б яна знялася аголенай; Бейонсе — спявачка, якая, па дадзеных Forbes, зарабляе больш, чым Рыяна; Марыя Бэла — акторка польска-італьянскага паходжання, што двойчы намінавалася на «Залаты глобус», ды іншыя дзяўчаты кіно, спорту, мастацтва.

Вікторыя Азаранка заняла высокае месца не толькі ў рэйтынгу сэксуальных жанчын, але і вярнулася на трэцяе месца ў рэйтынгу ВТА. Мінулы тыдзень (3–9 кастрычніка) яна правяла на чацвёртай пазіцыі. На апошнім турніры ў Пекіне Азаранка выйшла ў трэці круг, у якім адмовілася ўдзельнічаць з-за траўмы. Год таму спартсменка выбыла ў другім раўндзе.



### ВІТАЛЬ КУЛІК

Першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віталь Кулік паведаміў журналістам, што «Мінпрыроды сур'ёзна працавала над праектам АЭС у частцы ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, якую прадставілі праектанты». «Мы сцвярджаем, што праект адпрацаваны досыць добра, — цытуе Куліка БелаПАН. — Апошняе заключэнне Інстытута геахіміі і аховы навакольнага асяроддзя Нацыянальнай акадэміі навук Украіны пацвярджае, што праектныя і пазапраектныя аварыі акажуць уздзеянне практычна толькі на тэрыторыю станцыі». Ён паведаміў, што падтрымліваецца пастаянны кантакт з літоўскім бокам — вядзецца перапіска, прайшлі слуханні ў Вільнюсе, кансультацыі з шырокім колам прадстаўнікоў літоўскіх спецыялістаў і грамадскасці, дэпутатаў сейма. «Мы даказалі, што праект нашай станцыі адпавядае ўсім стандартам бяспекі, — паведаміў Кулік. — Спецыялісты гэта разумеюць, а вось палітыкі, на жаль, імкнуцца прыўнесці нешта такое, каб зарабіць балы на гэтай тэме». Раней літоўскі бок вельмі негатыўна адрэагаваў на намеры Беларусі пабудаваць атамную станцыю ў 50-ці кіламетрах ад Вільнюса. Спецыялісты папярэджвалі, што ў выпадку аварыі на станцыі трэба будзе эвакуяваць жыхароў сталіцы Літвы.

Беларусь і Расія ўжо падпісалі кантрактнае пагадненне на збудаванне першай чаргі АЭС на тэрыторыі Беларусі. Аднак практычныя работы па будаўніцтву аб'екта адкладаюцца. Каб іх пачаць, бакам неабходна ўзгадніць парадак і ўмовы фінансавання праекта. Але крэдытнае пагадненне пакуль не падпісанае.

### ГАЛІНА АДАМОВІЧ



Фільм «Инокиня» беларускага рэжысёра Галіны Адамовіч заваяваў Гран-пры фестывалю дакументальнага кіно «Расія». Пра гэта БелаПАН паведаміла Марына Асмалоўская-Пятрова, начальнік аддзела па сувязях з грамадскасцю Студыі ў імя св. Іаана Воіна пры Свята-Елісавецінскім жаночым манастыры ў Мінску, сіламі якой здымалася кінакарціна — фаварыт фестывалю.

Дакументальны фільм апавядае аб духоўным шляху вядомага беларускага кампазітара, маці траіх дзяцей Ірыны Дзянісавай. «Галоўная гераіня трапіла ў манастыр, потым пастрыглася, і на дадзены момант яна ўжо манашка Свята-Елісавецінскага жаночага манастыра», — адзначыла Асмалоўская-Пятрова, дадаўшы, што фільм быў зняты ў 2010 годзе.

Прэм'ера «Инокини» адбылася ў мінулым годзе на кінафестывалі «Лістапад». Пазней фільм паказвалі на розных фестывалях і выставах у Маскве, ён быў удастоены Гран-пры міжнароднага Срэценскага праваслаўнага кінафестывалю «Сустрэча» ў Обнінску (Расія).

Фестываль «Расія» з'яўляецца самым прадстаўнічым у суседняй краіне штогадовым творчым конкурсам дакументальнага кіно. Яго заснавальнікі — Саюз кінематаграфістаў Расіі, Расійскі фонд культуры, Нацыянальная акадэмія кінематаграфічных мастацтваў і навук Расіі. Для ўдзелу ў фінале фестывалю з 300 карцін было адабрана 29. У склад журы, узначаленага першым намеснікам старшыні Саюза кінематаграфістаў Расіі Сяргеем Лазаруком, увайшоў таксама старшыня Беларускага саюза кінематаграфістаў Віктар Васільеў.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ПРА СВАБОДУ І БУЛЬБЯНЫЯ АБІРКІ

Сяргей НІКАЛЮК




**Эканамічны крызіс, які накрыў Беларусь, — толькі водгук крызісу грамадства, яго неканкурэнтаздольнасці.**

Вераснёўскае апытанне НІСЭПД зафіксавала гістарычны мінімум электаральнага рэйтынгу «адзінага палітыка» (АП) — 20,5%. Пры такім узроўні інфляцыі нічога іншага чакаць і не даводзілася. Сакавіцкі «рэкорд» 2003 года, што быў справакаваны запаволеннем тэмпаў росту рэальных прыбыткаў насельніцтва пасля галавакружнага ўзлёту ў год другіх прэзідэнцкіх выбараў, зараз перакрыты на 5,7 пункта. Бо сёння гаворка ідзе не пра зніжэнне тэмпаў росту, а пра падзенне рэальных прыбыткаў.

З другой паловы 2003 года рэйтынг АП зноў пайшоў угару — дзякуй амерыканскім біржавым спекулянтам. Яны разагналі кошты на нафту. Расія перапоўнілася нафтадоларамі. Попыт на беларускія тавары павялічыўся, а тут яшчэ «нафтавы афшор» дазволіў запоўніць да краёў бюджэтныя засекі. Ну як тут было не пацешыць электарат чарговай порцыяй сацыяльных выплат!

## Не ў ролі віцязя, а ў ролі самарыцяніна

Галоўны твор Леніна — «партыя новага тыпу». Яе навізна палягала ў тым, што яна была арганізавана на ваенны ўзор. Загады вышэйстаячых ніжэйшым у партыі не абмяркоўваліся. Такая структура была ідэальнай для прыняцця «кульгавых рашэнняў» ва ўмовах расколатага грамадства. У гэтай сувязі ўспамінаецца анекдот: «Вы вагаліся калі-небудзь? — Так, але толькі разам з лініяй партыі». Любое сваё рашэнне «партыя новага тыпу» магла змяніць на процілеглае. Пры гэтым абодва ўзаемавыключальных рашэнні заставаліся ў рэчышчы генеральнай лініі. Падпісанне германа-савецкай дамовы пра сяброўства і межы — адзін з прыкладаў такога развароту на 180 градусаў.

А зараз з савецкага мінулага перанясемся ў беларускую сучаснасць. «Основная задача на ближайшие пять лет — довести качество жизни наших граждан до уровня, сравнимого с западноевропейским». Гэта цытата з перадвыбарнай праграмы галоўнага прэтэндэнта на прэзідэнцкую пасаду ў 2006 годзе. Праходзіць чатыры гады. Усё той жа прэтэндэнт на ўсё тую ж пасаду карэктуе асноўную задачу: «К 2015 году уровень жизни в Беларуси приблизится к европейскому». Але ўсё цячэ, усё змяняецца. І 30 верасня ў Маладзечне ўжо не прэтэндэнт, а чатырохкратны АП упэўненымі мазкамі малюе чарговую перспектыву: «Главное, чтобы был покой, чтобы было что поесть и во что одеться».

Такая дынаміка, як няцяжка здагадацца, разглядаецца ў якасці адказу тым, «кто утверждает, что белорусская модель себя исчерпала». Гэта глыбока памылковае ўяўленне, а таму «никакого отхода от того курса, который определен нами и утвержден на Всебелорусском народном собрании, нет и быть не может».

Курс, зададзены зверху, нягледзячы на ўсе яго неймаверныя піруэты, — заўсёды правільны. Прынамсі, так мяркуюць тыя, хто яго фармуе. Але, як ужо адзначалася вышэй, усё цячэ, і ўсё змяняецца. Калі ў сталінскія часы перад знешняй пагрозай грамадства было гатовае трываць любыя цяжкасці, то сучасны беларус хоча спажываць. Ён інфікаваны бацылай утылітарызму, і ўлада яму патрэбная не ў ролі віцязя ў тыгравай шкуры, а ў ролі добрага самарыцяніна.

Улада гэта разумее. Прыводжу адпаведную цытату: «Мы будем делать все для того, чтобы не снизить тот уровень поддержки народа, который мы всегда демонстрировали. Мы ни в коем случае от этой политики не отойдем». Хто б пярэчыў, праблема, аднак, палягае ў тым, што мяркуе беларус пра ўладу не па словах, а па справах, гэта і зафіксавала вераснёўскае апытанне НІСЭПД.

## Калі б не адно «але»

Публікацыя вынікаў вераснёўскага апытання НІСЭПД суправаджалася актыўнымі каментарамі ў сеціве. Як звычайна, спрэчка разгарэлася вакол праблемы давяраць/ не давяраць апытанню. Шмат хто пры гэтым спасылаўся на «фактар страху», які нібы істотна завышае рэйтынг АП. Нічога новага ў гэтым няма. Справа не ў фактары страху і не ва ўзроўні ангажаванасці сацыёлагаў, а ў неразуменні прыроды аўтарытарнай улады ў яе беларускім варыянце. Прадстаўнікі «меншасці» — а гэта, як правіла, людзі адукаваныя — усё ніяк не могуць вызваліцца ад асноўнай памылкі інтэлігенцыі. Яны ўяўляюць сабе народ у якасці «ахвяры рэжыму». Памылка гэта нарадзілася не сёння. Дастаткова ўзгадаць уступныя радкі «Варшавянкі», аўтарам рускай версіі якой з'яўляецца выпускнік Санкт-Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута Глеб Кржыжаноўскі: «Вихри враждебные веют над нами, темные силы нас злобно гнетут».

Згодна з асноўнай памылкай інтэлігенцыі, «народ заўсёды з'яўляецца гатовым, спелым і дасканалым, і трэба толькі разбурыць стары дзяржаўны лад, каб для народа адразу ж сталася магчымым ажыццявіць самыя карэнныя рэформы, самую грандыёзную працу грамадскай свядомасці» (Павел Наўгародцаў, рускі філосаф). Калі казаць больш спрошчана, то народу бракуе Свабоды. Задача інтэлігенцыі якраз у тым і палягае, каб паказаць народу самы кароткі шлях да яе, а яшчэ лепш — народу яе проста даць.

Калі пад Свабодай разумець адсутнасць прыгнёту з боку «цёмных сіл», то напачатку 90-х гадоў менавіта такую сітуацыю мы і назіралі. Але адбылося гэта не ў выніку высілкаў інтэлігенцыі. Улада, як заўважыў АП, «оказалась в грязи». Яна страціла здольнасць да самаўзнаўлення, і разам з яе падзеннем у бруд на беларусаў абрынулася Свабода, г. зн. адказнасць за свой уласны лёс, лёс сваіх блізкіх і за краіну ў цэлым.

Далей я даю слова сацыёлагу Юрыю Леваду: «Як толькі чалавека вызвалілі, ён кінуўся назад, нават не да ўчорашняга, а да пазаўчарашняга дня. Ён стаў традыцыйным, ён пачаў уяўляць сабой чалавека дапятроўскага, а не проста дасавецкага». Вось гэты дасавецкі, дапятроўскі чалавек і атрымаў права выбіраць на першых свабодных і дэмакратычных выбарах. І ён свой выбар зрабіў на карысць таго, хто вызваліў яго ад далейшага выбару, такім чынам, і ад асабістай адказнасці.

Вернемся ў Маладзечна і працягнем цытату: «...и мы накормим свой народ. Одеть — мы народ оденем. В школу детишек надо было отправить — мы их отправили, как бы сложно ни было, поддержали многодетные семьи». Калі і бывае ў жыцці ідэал, дык вось ён, перад вамі. «Сустракайце!» — як кажуць вядоўцы галаканцэртаў. І ўсё было б выдатна, калі б не адно «але». Ніводная ўлада накарміць, а да таго ж яшчэ і апрануць народ працяглы час не ў стане.

У кароткатэрміновым рэжыме такое магчыма. Але для гэтага неабходная знешняя крыніца фінансавання. У якасці такой крыніцы для Беларусі першапачаткова выступалі расійскія датацыі, пасля таго, як яны пачалі перасыхаць, гэта паспрабавалі кампенсаваць крэдытамі. Звернемся да афіцыйнай статыстыкі: з пачатку года па 1 верасня аб'ём дзяржаўнай запазычанасці павялічыўся на 96,6%. Дзе тыя залатыя часы, калі з трыбуны чарговага «ўсенароднага веча» АП мог не хітруючы заявіць: «Мы не разбазарили народное богатство, не влезли в обременительные долги»?

Сёння дзяржаўная запазычанасць наблізілася да адзнакі ў 50% ВУП. І не варта сябе суцяшаць тым, што да перададэфолтнай Грэцыі з яе 150% нам яшчэ далёка. Пры нашых тэмпах за пару гадоў мы яе дагонім і перагонім. Дарэчы, прычына грэчаскай трагедыі падобная да беларускай. У эпоху танных крэдытаў тамтэйшая ўлада праводзіла «моцную сацыяльную палітыку», г. зн. карміла і апранала народ. Але ў 2008 годзе грымнуў сусветны фінансавы крызіс, і нечакана высветлілася, што ўлада не толькі апранула народ, але і абула...

## Вось у вось гэтым і праблема!

Падараваная свабода — гэта заўсёды пераход з адной формы несвабоды ў іншую. Была несвабода савецкага ўзору, стала ўзору АП. Эканамічны крызіс, дадзены нам у надзвычай канкрэтных адчуваннях, насамрэч з'яўляецца толькі водгукам крызісу грамадства. Неканкурэнтаздольнасць «беларускай эканамічнай мадэлі» — гэта толькі следства неканкурэнтаздольнасці грамадства. Таму наборам стандартных эканамічных мераў, якія свае і заезджыя ліберальныя эканамісты прапануюць оптам і ў розніцу, сітуацыю не выправіць.

Паспяховыя эканамічныя рэформы праводзяцца не эканамістамі, а палітыкамі, г. зн. людзьмі, чыя прафесійная дзейнасць палягае ва ўзгадненні інтарэсаў розных сацыяльных груп. Але самі гэтыя інтарэсы палітыкі стварыць не ў стане. Яны ці ёсць, ці іх няма. Даю слова эстонскаму дыпламату Мацці Маасікасу: «Без усеагульнай падтрымкі народа рэформы былі б не магчымыя. І такая падтрымка была. Эстонцы ў часы аднаўлення незалежнасці часта карысталіся фразай: «За свабоду мы гатовыя есці нават бульбяныя абіркі». Зразумела, сацыяльныя выдаткі мелі месца. <...> Аднак большасць людзей верыла ў тое, што цяжкасці гэтыя часовыя. Па дадзеных сацыялагічных апытанняў, на працягу ўсіх 1990-х гадоў трэціна насельніцтва краіны лічыла, што да рэформаў жыць было лягчэй. Але гэта не значыць, што людзі хацелі вярнуцца ў мінулае. Не хацелі. А цяпер большасці тых праблем даўно ўжо не існуе. Эстонская эканоміка дынамічна развіваецца, што істотна адбіваецца на ўзроўні жыцця насельніцтва».

А зараз уявіце сабе беларускага палітыка, які прапануе дзеля свабоды харчавацца бульбянымі абіркамі. Уявілі? Калі атрымалася, то змясціце гэтага палітыка ў інтэр'ер свабодных і дэмакратычных выбараў. На які ўзровень падтрымкі ён зможа разлічваць? Вось у гэтым і праблема!

Безумоўна, я згушчаю фарбы і раблю гэта свядома, але праблема Беларусі палягае не ў тым, каб змяніць палітычны рэжым, а ў тым, каб падчас гэтай замены краіна не зруйнавалася. Калі на Захадзе рэформы — гэта заўсёды адказ эліты на ціск пэўных пластоў, і адказ гэты фармуецца падчас дыялогу, то ў расколатым грамадстве эліты распачынаюць рэформы ў выніку пагрозы хаосу. Пры гэтым рознымі часткамі расколатага грамадства рэформы, натуральна, успрымаюцца неадназначна.

Дадзяржаўная «большасць», як паказвае гістарычны досвед, чакае ад рэформаў цуду. Але цуд не можа быць прадметам дыялогу, таму ўсе папярэднія рэформы, якія праводзяцца зверху, нягледзячы на добрыя намеры іх ініцыятараў, вельмі хутка прымалі адміністрацыйна-бюракратычны характар. Ці здагадваюцца пра гэта тыя, хто сёння наперабой прапануе свае рэцэпты беларускай эканомікі?

МЕРКАВАННЕ

# СПАБОРНІЧАЮЦЬ З СОНЦАМ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Дзякуючы дэвальвацыі, якая ўжо амаль у два разы скараціла ўнутраны спажывецкі попыт (а значыць, і імпарт) і адначасова дала стымул для падвышэння экспарту, памеры знешнегандлёвага тавараабароту Беларусі значна павысіліся.**



І — тут праўду сказаў Лукашэнка — валюта пайшла ў краіну, як ніколі раней. Чарговы цуд ці справа яго ўмелых ручак? Усяго патроху. Прынамсі, для Беларусі на знешніх рынках склалася адносна добрая кан'юнктура. Сярэднія цэны экспарту за сем месяцаў бягучага года павысіліся на 26,2% у параўнанні са снежнем-ліпенем мінулага года, што забяспечыла 52,7% прыросту экспарту. Халява, сэр! Менавіта такую сітуацыю афіцыйны Мінск вызначае як цуд.

Астатні прырост таварнай масы экспарту забяспечаны падвышэннем фізічных аб'ёмаў паставак. Пачалі прадаваць болей машын і механізмаў, нафтапрадуктаў.

Гэтаму, зноў жа, паспрыяла і цэнавая кан'юнктура — кошты на імпарт падвышаліся не так хутка, і таму яго прырост на 60,2% забяспечаны падвышэннем фізічных памераў закупак.

Па інфармацыі Белстата, індэкс коштавых стасункаў знешняга гандлю склаў 108,6%. Гэта значыць, што ў студзені-снежні ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года на суму выручкі экспарту можна было закупіць на 8,6% імпартных тавараў болей.

Вось яна, тэндэнцыя, пра якую разважалі напачатку года Лукашэнка, Пракаповіч, тады яшчэ галоўны банкір, і наноў прызначаны прэм'ер Мясніковіч. Агульны аб'ём знешняга гандлю павялічыўся да 48,2 мільярда долараў (на 56,5%), у тым ліку экспарт — да 21,9 (плюс 65%), імпарт — да 26,3 мільярда долараў (на 50,1%). Такім чынам, экспарт па тэмпах павелічэння аб'ёмаў пачаў абганяць імпарт. Гэта азначала, што Беларусь зрабіла першы рашучы крок да выхаду на дадатнае знешнегандлёвае сальда.

І ўсё было б добра, каб правы на знешнегандлёвую дзейнасць належалі толькі ўраду, адміністрацыі прэзідэнта ды самому прэзідэнту. На жаль (гэта было зроблена яшчэ да Лукашэнкі) такімі правамі надзелены як прыватныя бізнэсоўцы, так і шараговыя грамадзяне. І калі Лукашэнка зрабіў афіцыйную абвестку, што з 1 ліпеня ў Беларусі, якая ўступіла ў Мытны саюз з Расіяй і Казахстанам, падвышаюцца мыты на замежныя легкавікі, то амаль усе аўтааматары захацелі памяняць свае старыя іншамаркі на больш новыя. Каб не гэта акалічнасць, ніякага б ажыятажу не было. Насельніцтва б паціху «купляла беларускае» на падвышаныя спецыяльна да прэзідэнцкіх выбараў заробкі, а Лукашэнка таксама паціху падвышаў бы спажывецкія кошты, каб неўпрыкмет канфіскаваць празмерныя набыткі. Прыкладам, так непрыкметна ссе кроў клешч, які ўпіўся ў цела.

Аднак у насельніцтва не было ніякага жадання карміць крывасмокаў. У каго была валюта, той наўпрост заангажаваў пасрэднікаў-перагоншчыкаў. У каго было дастаткова назапашана ў мясцовай валюце, памяняў яе ў абменніках, іншыя атрымалі валютныя крэдыты ў банках. У выніку іншамарак за 7 месяцаў было куплена 259 тысяч (у 2,1 разы болей) па сярэдняй цане 8500 долараў (на 34% даражэй, чым у мінулым годзе), а агульны кошт аўтаімпарту склаў 1,4 мільярда долараў. Не нейкага там умоўнага «бязналу», а самымі «настаяшчымі банкнотамі».

І вось гэтая, па мерках амаль што кожнай еўрапейскай краіны, дробязь насамрэч падарвала цалкам уяўную стабільнасць фінансавага рынка Беларусі. «Где стол был яств, там гроб стоит». Дзе на фоне залатых зліткаў фатаграфаваліся прэзідэнт з нашчадкам у кампаніі з галоўным банкірам — пустэча.

Падкрэслім, што насельніцтва выдаткоўвала выключна свае грошы, хоць у значнай ступені і не зароблены, і выкарыстала магчымасці, якія прадстаўляла яму фінансавая сістэма дзяржавы. Усё хоць і асабістае, але цалкам законнае. Гульня пачыналася «па-чэснаму» — пра падвышэнне мытаў абвясцілі загадзя, а не за тыдзень да іх увядзення. Таму цалкам не зразумелая крыўда, якую выказаў на падначаленых народ Лукашэнка. Было б больш сэнсу крыўдзіцца на Пуціна з Мядзведзевым, якія зазвалі яго ў Мытны саюз, а «пад'ёмных» у дастатковай колькасці не далі. Як заўжды, зболышага абышліся абяцанкамі.

У выніку, нягледзячы на спрыяльную кан'юнктуру, за сем месяцаў маем адмоўнае сальда ў гандлі таварамі ў памеры 4,317 мільярда долараў. А за такі ж перыяд 2010 года мелі 4,199 мільярда. Быццам бы зрухі і ёсць, калі ўлічыць аўтамабільнуюпературбацыю, але ж насельніцтва і надалей будзе купляць імпартныя тавары, якія ў Беларусі ці не вырабляюцца, ці не маюць дастатковай якасці. Пакуль што іх імпарт значна падвысіўся, а дадатнае сальда ў 114 мільёнаў змянілася на адмоўнае памерам у 907 мільёнаў долараў. Пагоршылася, такім чынам, больш чым на мільярд долараў.

Дарэчы, сітуацыя з прамысловым імпартам сведчыць аб праблемах з экспартам: калі самі беларусы па шэрагу пазіцый аддаюць перавагу прадукцыі замежных вытворцаў, чаго можна чакаць ад замежных спажыўцоў?

Сярод статыстычных паказнікаў гарадоў і раёнаў ёсць некалькі па сваім мясцовым каларыце ўнікальных. Прыкладам, Жлобінскі раён, паказнікі якога вызначаюцца амаль выключна Беларускім металургічным заводам, што пры 1,4 мільярда знешнегандлёвага тавараабароту мае 382 мільёны долараў дадатнага сальда. А Мінск пры аб'ёме тавараабароту ў 19,65 мільярда долараў (9,96 — экспарт, 9,69 імпарт) — толькі 270 мільёнаў. Пры гэтым Жлобін і год таму меў 276 мільёнаў перавышэння экспартнай выручкі над імпартнымі выдаткамі, а адмоўнае сальда Мінска складала 1,5 мільярда долараў.

Не надта складана вызначыць адносную і абсалютную эфектыўнасць аднаго металургічнага прадпрыемства і мноства мінскіх прамысловых гігантаў. Пра апошнія можна сказаць, што гара нарадзіла мыш. І тое добра, што нешта нарадзіла.

А вось Салігорскі раён — уласна кажучы, «Беларускалій» — 2,142 мільярда долараў тавараабарот, 2,011 мільярда долараў экспарт, 1,879 мільярда дадатнае знешнегандлёвае сальда. Пры тым, што і ў мінулым годзе было 1,317 мільярда.

Свае адметныя рысы мае так званая нафтанка. У Наваполацку пры тавараабароце ў 2,455 мільярда, экспарт складае 568 мільёнаў, імпарт — 1,886 мільярда, сальда адмоўнае — 1,317 мільярдаў. Можна лічыць, што адзін толькі «Нафтан» «з'ядае» каля 70% валютнай выручкі «Беларуськалія». І адсюль бярэ пачатак практычна невырашальная праблема з энерганосьбітамі. Іх трэба купляць усё болей, каб задавальняць патрэбы прамысловасці і іншых галін (адзначым асобую ролю ў гэтай справе ненажорных энергетычных вампіраў, кшталту лядовых палацаў, асабліва калі яны абслугоўваюць розныя прэзідэнцкія «некамерцыйныя» гульні), і пры гэтым скарачаць іх экспарт, пазбаўляючы прадпрыемства, бюджэт, краіну магчымасці зарабляць валюту.

Можна прывесці мноства прыкладаў эканамічнай неэфектыўнасці як традыцыйных галін вытворчасці, так і новых. Прыкладам, велізарных цяплічных гаспадарак, якія спажываюць энергію ў велізарных колькасцях, пастаўляюць на ўнутраны рынак бясконца дарагія агуркі і памідоры. За наш кошт спаборнічаюць з вытворцамі краін, дзе нават узімку не бывае холадна. Можна сказаць, спрабуюць спаборнічаць з самім Сонцам. За наш кошт.

Вось і атрымоўваецца, што Мінэнерга, якое купляе газ для выпрацоўкі электрычнай ды цеплавой энергіі, не толькі не зменшыла адмоўнае сальда, а нават павялічыла яго з 2,2 да 3,1 мільярда долараў.

Нават самая прымітыўная эканоміка існуе дзеля таго, каб зарабляць болей, чым выдаткоўваць. Увогуле, яна з гэтага і пачынаецца. А што тады сказаць пра нашу?..

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ

# МТС НАРЭШЦЕ ПРАДАЮЦЬ

Вольга ХВОІН

**Буйнейшага беларускага аператара сотавай сувязі СТАА «МТС» выставілі на продаж. Але грошы ад угоды дзяржава хацела б атрымаць у цвёрдай валюце, а не беларускімі рублямі.**

Да 15 лістапада ад інвестараў чакаюць пакетаў дакументаў на ўдзел у конкурсе. Аўкцыён пройдзе 1 снежня, стартавая цана — 1 мільярд долараў. Першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Сяргей Пяткоў адзначыў, што МТС — найбольш дарагі брэнд сярод усіх беларускіх аператараў сувязі.

Дырэктар Фонду дзяржмаёмасці Наталля Жарнасек адзначыла, што ацэнку МТС рабіла дзяржаўнае прадпрыемства «Інстытут нерухомасці і ацэнкі» «з захаваннем падыходаў, абумоўленых міжнароднымі стандартамі ацэнкі, і тымі стандартамі, якія дзейнічаюць у галіне ацэначнай дзейнасці ў Беларусі». Калі аўкцыён у снежні пройдзе безвынікова, то цана актыву можа быць зніжана, але гэтае пытанне канчаткова будзе вырашаць кіраўнік дзяржавы. Заплаціць за набыццё часткі кампаніі рублямі нельга, гэта «прадугледжана ў доларавым эквіваленце», паведаміла чыноўніца.

Сотавы аператар МТС па стане на 1 кастрычніка абслугоўваў у Беларусі 4 843 000 абанентаў. У першым паўгоддзі 2011 года выручка СТАА «МТС» у беларускіх рублях вырасла на 23%, сярэдняя прыбытковасць на абанента — на 13,1%, працягласць размовы на аднаго абанента павялічылася на 12,3 % да 515 хвілін, капітальныя ўкладанні аператара за першае паўгоддзе — 91 мільярд рублёў.

Кантрольным пакетам МТС-Беларусь раней цікавіўся і сузаснавальнік, расійскае ААТ «Мабільныя ТэлеСістэмы», аднак бакі не прыйшлі да пагаднення.

У сакавіку гэтага года Аляксандр Лукашэнка заявіў пра гатоўнасць дзяржавы прадаць свой пакет за 1 мільярд долараў, а ў выпадку адмовы прыгразіў выставіць 51% СТАА «МТС» на аўкцыён. У красавіку віцэ-прэзідэнт ААТ «МТС» Алег Распопаў адзначыў, што кампанія гатова выкупіць кантрольны пакет у беларускім МТС «па разумнай цане». Летам старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь Георгій Кузняцоў расказаў, што расійскае ААТ «МТС» прапаноўвала за кантрольны пакет удвая меншую суму, чым хацеў атрымаць беларускі бок.

ТРЭЦІ СЕКТАР



# ЛЕАНІД ЗАІКА

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Пачатак гэтага артыкула я ўбачыў на Камароўскім рынку. На майцы аднаго з пакупнікоў было напісана: «Жыццё сумнае, затое зарплата смешная». Вельмі крэатыўная падказка зрабіць героем чарговага нарыса кагосьці з эканамістаў. На мой погляд, адзін з самых лепшых у іх кампаніі — кіраўнік аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Леанід Заіка.**

## Касмапалітычны дэбют

Касмапалітам сябе называе сам Леанід Фёдаравіч. І мае рацыю: яго бацька, Фёдар Іванавіч, родам з Украіны, маці, Галіна Раманаўна, — з расійскага Курску, а сам ён нарадзіўся 23 жніўня 1948 года ў беларускім Гродне. Дарэчы, згодна з сацыялагічнымі апытаннямі, такімі «касмапалітамі» сябе лічаць каля сямі працэнтаў грамадзян Беларусі.

Бацька будучага эканаміста быў вайскоўцам (камандзір палка), і таму дзяцінства нашага героя пераважна прайшло ў вайсковых гарнізонах. Некалькі з іх прыйшліся на Германію, куды Фёдара Іванавіча перавялі ў 1959 годзе. Мабыць, там яго сын Лёня і зразумеў, што ўзровень жыцця Савецкага Саюза значна саступае замежным стандартам.

Не ведаю, чым было абумоўлена тое глупства, але ў СССР дзеці вайскоўцаў, што служылі за межамі краіны, мелі права знаходзіцца разам з бацькамі толькі да 16-гадовага ўзросту. Потым іх неабходна было адпраўляць у СССР. Так Леанід Заіка на кароткі тэрмін зноў апынуўся ў родным Гродне. Хутка ў Беларусь, у Слуцк, вярнулі яго бацьку, які неўзабаве пераехаў у Мінск.

Тут восенню 1965 года Леанід Заіка і пайшоў у апошні (11-ы) клас адной са школ. Скончыў школу з залатым медалём і паступіў на гандлёвы факультэт Інстытута народнай гаспадаркі.

## Эканамічны дэбют

Паралельна з Наргасам у Леаніда Заікі ўзнікла жаданне паступіць у інстытут замежных моваў, таму што пасля жыцця ў Германіі (і не толькі) ён добра ўсвядоміў, што без ведання замежнай мовы дабіцца нечага істотнага не магчыма. На жаль, ажыццявіць свой намер у той час яму не ўдалося, бо на паралельнае навучанне ў дзвюх ВНУ патрабаваўся дазвол аж на ўзроўні намесніка міністра адукацыі.

Але, хаця і праз шмат гадоў, ён скончыць курсы англійскай і французскай моваў, дадаўшы іх да нямецкай, якой авалодаў за гады жыцця ў Германіі.

Вучыцца на адну стыпендыю за савецкім часам было практычна не магчыма, хаця параўнальна з сённяшняй яна была значна вышэй. Леаніду Заіку было не проста цяжка, а вельмі цяжка, бо акрамя яго ў сям'і было яшчэ два браты і сястра.

Паралельна з вучобай Леанід пачаў працаваць. Днём — вучоба, вечарам — работа. Працаўладкаваўся ў сталічны Дзяржаўны універмаг (ГУМ) дэманстратарам музычнай секцыі. Кансультаваў пакупнікоў, даваў ім парады.

Час ад часу туды заходзіў будучая зорка савецкай эстрады Юры Антонаў і пачынаў граць на піяніна. Збіраўся цэлы натоўп.

Чаму менавіта такі выбар? Справа ў тым, што Заіка быў заядлым «бітламанам» не толькі тэарэтычна, але і практычна. Разам з аднадумцамі ён стварыў «сваю каманду» і граў на танцах. Дарэчы, такім жа шляхам ішоў тады і вядомы зараз Аляксандр Ціхановіч.

На трэцім курсе яму «зарубілі» Ленінскую стыпендыю. Парткам не прапусціў хлопца з доўгімі валасамі, у модных акулярах і з гітарай у руцэ.

Нягледзячы на «несавецкі» выгляд, вучыўся Леанід Заіка выдатна, і на чацвёртым курсе яму прапанавалі пайсці ў аспірантуру. Так і зрабіў.

У 1974 годзе Заіка абараніў кандыдацкую дысертацыю, а ў наступным стаў выкладаць у родным Наргасе.

## «Палітычны» дэбют

Двукоссе тут невыпадковае, бо чыстай палітыкай Леанід Заіка ніколі не займаўся. Яна сама пачала «займацца» ім, бо, як вядома, з'яўляецца «канцэнтраваным выражэннем эканомікі».

У 1983 годзе ён пачаў выкладаць у Інстытуце павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў, а пасля стварэння Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (ЕГУ) стаў там першым дэканам факультэта эканомікі, адпрацаваў на гэтай пасадзе тры гады. Цікава, што прэзентацыя ЕГУ, якую вёў Леанід Заіка, адбылася ў тым самым будынку, дзе зараз афіцыйна лічаць «адукацыйных эмігрантаў» сваімі ідэалагічнымі візаві.

У 1988 годзе Леанід Заіка паехаў на гадавую стажыроўку ў Кітай, дзе вывучаў досвед, які ў апошнія дзесяцігоддзе стаў па сутнасці дзяржаўным арыенцірам. Але ў адрозненне ад дзяржаўных чыноўнікаў, сярод якіх няма сапраўдных эканамістаў-тэарэтыкаў, у яго былі яшчэ падобныя камандзіроўкі ў Злучаныя Штаты Амерыкі, Вялікабрытанію і іншыя краіны, куды «дзяржаўнікаў» амаль не запрашаюць.

У гэты ж час лёс звёў яго з Анатолем Майсенем. Пазнаёміўся ў «спецхране» былой «ленінкі». Працавалі там толькі тыя, хто ведаў замежныя мовы. Звычайна, такіх было не больш за 10–15 чалавек. Вельмі хутка яны сталі «адной камандай», і таму з'яўленне пасля путчу 1991 года Нацыянальнага цэнтра стратэгічных ініцыятываў (НЦСІ) «Усход–Захад» было цалкам лагічным.

З пачаткам перабудовы на Беларускім тэлебачанні з'явілася новая перадача — размовы на міжнародныя тэмы. Вёў іх Леанід Заіка. Адной з самых цікавых стала размова з унукам «жалезнага канцлера» Бісмарка, які ў той момант узначальваў знакаміты інстытут Гётэ і прыехаў у Мінск па запрашэнню нямецкай амбасады.

Потым Леанід Заіка «перадаў» сваю праграму Анатолю Майсеню, які вырашыў зрабіць крэн у бок журналістыкі. Так бывае толькі паміж людзьмі, якія вельмі блізкія па духу, таму можна толькі ўявіць, якой стратай для яго стала трагічная смерць Майсені 12 лістапада 1996 года.

Але НЦСІ «Усход–Захад» перастаў існаваць зусім не па гэтай прычыне.

Пасля рэферэндуму 1996 года Вярхоўны Савет 13 склікання, мякка кажучы, апынуўся ў апале. Яго спікер Сямён Шарэцкі папрасіў Леаніда Заіку правесці на іх пляцоўцы пасяджэнне па аграрных пытаннях, бо ў іншыя месцы іх не пускалі. Той пагадзіўся, што і стала прычынай яго «палітычнага» дэбюту.

## Дэбют «санта-барбары»

Так НЦСІ «Усход–Захад» стаў «гняздом апазіцыі». Літаральна на наступны дзень пасля таго, як адбылося гэта пасяджэнне, да іх, па даручэнню тагачаснага сакратара Савета бяспекі Шэймана, прыйшла праверка.

І пачала шукаць па сейфах «мільёны апазіцыі».

Аб узроўні тых, хто праводзіў «рэвізію», шмат гаварыць не трэба. Дастаткова аднаго факту. Праз тры дні работы «рэвізоры» спыталіся: «А хто такі грант і чаму гэты чалавек дае вам грошы?..»

У савеце НЦСІ «Усход–Захад» на той час былі Тамара Віннікава, Міхаіл Мясніковіч, Павел Якубовіч, Зміцер Булахаў, аднак гэта не выратавала ад сумнага выніку. У 1997 годзе ў «кампаніі» з фондам Сораса і фондам «Дзеці Чарнобылю» юрыдычна ён спыніў сваё існаванне.

У гэты ж час з'явілася ідэя стварэння беларуска-нямецкага Мінскага форуму, які тады і дэбютаваў. Леанід Заіка быў сярод першых заснавальнікаў і вельмі спадзяваўся, што «пляцоўка» для дыялогу паміж апазіцыяй і ўладай ніколі не будзе пустой. На жаль, менавіта гэта ў 2011 годзе і здарылася.

У нейкім сэнсе аналітычны цэнтр «Стратэгія» працягнуў справу НЦСІ «Усход–Захад». Перад рэгістрацыяй яго заснавальнікі прозвішчам Заікі вырашылі не дражніць гусей, таму першым дырэктарам быў вядомы юрыст Сяргей Леўшуноў. Праз год яго замянілі Леанідам Заікам, які ўзначальвае структуру і зараз.

## Туманная будучыня

Нічога не хачу сказаць пра ўзровень некаторых высокіх кіраўнікоў, аднак упэўнены, што іх адукацыі і эрудыцыі недастаткова, каб узначальваць галоўную банкаўскую ўстанову краіны... І базы завочнага Наргаса тут яўна недастаткова…

Напэўна, адсюль і «вынікі». Самае цікавае, што іх можна было б пазбегнуць. На погляд Леаніда Заікі, калі б урадам яшчэ вясной гэтага года былі прынятыя адпаведныя меры (значнае скарачэнне колькасці чыноўнікаў, іх заробкаў, «каштоўных» праграм і г.д.), сённяшніх астранамічных курсаў валют можна было б пазбегнуць.

Як вядома, гэтага не адбылося, таму і будучыня нас чакае даволі трывожная. Радуе, што беларускі рубель крыху ўзмацніўся, але аналітыкі ў адзін голас сцвярджаюць, што робіцца гэта не рынкавымі, а адміністрацыйнымі метадамі, таму пра рэальную карціну пакуль сказаць вельмі цяжка.

Рэальныя толькі кошты ў крамах. Напрыклад, тая ж каўбаса сягае ўжо за 100 тысяч беларускіх рублёў за кілаграм. Леанід Заіка хоча адрэзаць ад яе кавалак на адну тысячу і паслаць яе Міхаілу Мясніковічу. Каб лепш было бачна, колькі зараз каштуе беларускі рубель…

## 19 КАСТРЫЧНІКА, СЕРАДА

---

**06.00, 07.05, 08.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтарэсаў». Эканамічная праграма.
**09.10** Вострасюжэтны серыял «Рабінзон».
**10.05** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**11.00** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**12.10** Дэтэктыў «Мім Бім, або Чужое жыццё» (Украіна-Расія).
**14.00** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда»(Украіна).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультфільм «Ну, пачакай!».
**15.55** «Смяюся.. Плачу.. Кахаю..» Дакументальны фільм.
**16.40** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**17.45** Меладраматычны серыял «Дыхай са мной» (Расія). Заключная серыя.
**18.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Рабінзон» (Расія). Заключная серыя.
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Мілан - БАТЭ. Прамая трансляцыя.
**23.50** Дзень спорту.
**00.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.

---

**06.00, 09.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** Прэм'ера. «Паляўнічыя за дыяментамі». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Шматсер. фільм.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Паляўнічыя за дыяментамі». Шматсерыйны фільм.
**22.20** Прэм'ера. «Зняволены». Шматсерыйны фільм.
**23.20** Асяроддзе пасялення.
**00.20** «След».
**01.40** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «З Парыжу з каханнем». Францыя , 2009 г.
**10.40** «Прагнасць».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Хірамант». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**16.50** « Прыгоды дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «На мяжы парыву». ЗША, 1997 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Мінск і мінчане».
**23.30** «Дабро пажаліцца».
**23.55** «Хірамант». Серыял.
**00.50** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**10.00** Альбарутэнія.
**10.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Напалі - Баварыя.
**12.40** Спорт-кадр.
**13.10** Баявік «Мужчынскі характар, або Танга над прорвай-2» (Расія - Малдова).
**15.05** Жаночая ліга.
**16.05** Медычныя таямніцы.
**16.40** Меладрама «Пяшчотная зіма» (Беларусь-Расія). 3-я серыя.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**19.55** «Беларуская часіна».
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Спортлато 5 з 36».
**21.25** КЕНО.
**21.30** Жаночая ліга.
**22.30** Рэальны свет.
**23.00** Меладрама «Пяшчотная зіма» (Беларусь-Расія). 3-я серыя.

**РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Хата ля вялікай ракі».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Бумеранг з мінулага».
**23.25** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.20** Навіны - Беларусь.
**00.30** «Гістарычны працэс».

**НТВ**

**06.00-08.55** Прафілактыка.
**08.55** «Дачны адказ».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.25** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**22.20** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**22.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Шахцёр» (Украіна) - «Зеніт» (Расія).
**00.45** Серыял «Сталіца граху».
**01.30** Серыял «Школа».

**EUROSPORT**

**09.30** Марафон. Познань (Польшча).
**10.30** Тэніс. Турнір WTA. Масква (Расія). Дзень 2-і.
**11.50** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA. Масква (Расія). Дзень 3-і.
**15.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**16.00** Спідвэй. Гран-пры. Капенгаген (Данія).
**17.00** Спідвэй. Гран-пры.
**18.00** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету. 1/2 фіналу.
**19.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**19.10** Тэніс. Турнір WTA. Масква (Расія). Дзень 3-і.
**20.45** Тэніс. «Матс поінт». Часопіс.
**21.25** Абранае па серадах.
**21.30** Конны спорт. Кубак свету. Канкур. Осла (Нарвегія).
**22.30** Навіны коннага спорту.
**22.35** Гольф. Тур PGA. The McGladrey Classic.
**23.35** Гольф (Партугалія).
**00.05** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**00.10** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.15** Абранае па серадах.
**00.30** Тэніс. Турнір WTA. Масква (Расія). Дзень 3-і.
**02.30** Тэхнічны перапынак.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Арол», серыял: 12 серыя.
**08.30, 14.50** Два на два (тэледыскусія): Яўген Вапа і Хведар Нюнька.
**09.00** «Тры шалёныя нулі», серыял: 4 серыя.
**09.25, 13.10** На колах.
**09.55** Рэпартэр.
**10.20, 14.30** Асабісты капітал.
**10.35, 15.30** Госць «Белсату».
**10.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.00** Беларусы ў Польшчы.
**11.20** «Гняздо», серыял: 6 серыя.
**12.10** «Арол», серыял: 12 серыя.
**13.40** «Тры шалёныя нулі», серыял: 4 серыя.
**14.05** Эксперт.
**15.15** МакраФон: «Minsk-Mixt–2008»: Канцэрт гурта «Ветах».
**15.45** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**15.55** Беларусы ў Польшчы.
**16.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.30** Рэпартэр.
**17.00** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 4 серыя.
**17.25** МакраФон: Канцэрт Змітра Вайцюшкевіча.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Прыстань», прыгодніцкі серыял: 3 серыя.
**18.50** «Дранько-Майсюк. Цацачны гандляр з Давыд-Гарадка», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**19.10** Асабісты капітал.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Праект «Будучыня».
**20.25** Навігатар.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Маю права.
**21.45** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 11 серыя.
**22.15** Два на два (тэледыскусія): Яўген Вапа і Хведар Нюнька.
**22.40** Аб'ектыў.
**23.05** Гарачы каментар.

## 20 КАСТРЫЧНІКА, ЧАЦВЕР

---

**06.00, 07.05, 08.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.20** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Вострасюжэтны серыял «Рабінзон» (Расія). Заключная серыя.
**10.05** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**11.00** Меладраматычны серыял «Дыхай са мной» (Расія). Заключная серыя.
**12.10** Меладрама «Час шчасця» (Расія).
**14.05** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультфільм «Ну, пачакай!».
**15.55** Прэм'ера. «Мір - нацыянальная жамчужына Беларусі». Дакументальны фільм.
**16.10** Здароўе.
**16.40** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**17.40** Меладраматычны серыял «Разумніца, прыгажуня» (Расія). 1-я серыя.
**18.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.45** Клуб рэдактараў.
**22.30** Крымінальны баявік «Выбух» (ЗША).
**00.30** Дзень спорту.
**00.45** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** Прэм'ера. «Паляўнічыя за дыяментамі». Шматсерыйны фільм.
**13.00** Нашы навіны.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Прэм'ера. «Шчаслівыя разам». Шматсерыйны фільм.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Паляўнічыя за дыяментамі». Шматсерыйны фільм.
**22.20** Прэм'ера. «Зняволены». Шматсерыйны фільм.
**23.20** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.50** «Зваротны адлік».
**00.20** «След».
**01.40** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** Фільм «На мяжы парыву». ЗША, 1997 г.
**10.40** «Зорныя гісторыі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Хірамант». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**16.50** «Пяць гісторый».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Адплата». ЗША - Вялікабрытанія, 2010 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Праўда».
**23.35** «Аўтапанарама».
**23.55** «Хірамант». Серыял.
**00.50** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**10.05** Альбарутэнія.
**10.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Марсэль - Арсенал.
**12.35** Рэальны свет.
**13.10** Страсці па культуры.
**13.50** Прыгодніцкая камедыя «Артыст і майстар малюнка» (Расія).
**16.05** Медычныя таямніцы.
**16.40** Меладрама «Пяшчотная зіма» (Беларусь-Расія). 4-я серыя, заключная.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Хакей. КХЛ. Салават Юлаеў (Уфа) - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Жаночая ліга.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Тотэнхем - Рубін Прамая трансляцыя.
**00.00** Час футболу.
**00.40** Меладрама «Пяшчотная зіма» (Беларусь-Расія). 4-я серыя, заключная.

**РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.10** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Бумеранг з мінулага».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Бумеранг з мінулага».
**23.25** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.20** Навіны - Беларусь.
**00.30** Прэм'ера. «Паядынак».

**НТВ**

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Таямнічая Расія».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.35** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.25** «Увага: вышук!».
**00.05** Серыял «Сталіца граху».
**00.50** Серыял «Школа».

**EUROSPORT**

**09.30** Матаспартыўны часопіс.
**09.45** Тэніс. «Матс поінт». Часопіс.
**10.15** Тэніс. Турнір WTA. Масква (Расія). Дзень 3-і.
**11.50** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**12.00, 19.10, 01.30** Тэніс. Турнір WTA. Масква (Расія). 1/8 фіналу.
**15.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**16.00** Спідвэй. Гран-пры.
**17.00** Спідвэй. Гран-пры.
**18.00** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету. Фінал.
**19.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**21.00** Байцоўскі клуб.
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**00.00** Покер. Агляд.
**01.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**02.30** Тэхнічны перапынак.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 11 серыя.
**08.00** «Прыстань», прыгодніцкі серыял: 3 серыя.
**08.45** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 4 серыя.
**09.10** Праект «Будучыня».
**09.40** «Смяротная нявіннасць», маст. фільм, 1991 г., ЗША.
**11.05** Госць «Белсату».
**11.25** Маю права.
**11.45** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**12.00** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**12.25** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 11 серыя.
**12.50** «Прыстань», прыгодніцкі серыял: 3 серыя.
**13.35** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.00** «Дранько-Майсюк. Цацачны гандляр з Давыд-Гарадка», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**14.20** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 4 серыя.
**14.50** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**15.15** «Смяротная нявіннасць», маст. фільм, 1991 г., ЗША.
**16.40** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**17.00** «Сонечная дзіда», серыял: 8 серыя.
**17.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**17.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.15** Госць «Белсату».
**18.20** «Малая Масква», серыял: 1 серыя.
**19.05** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Эксперт.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр.
**21.50** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Катка», дак. фільм, 2010 г., Чэхія.
**23.25** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 4 серыя.
**24.10** Аб'ектыў.
**00.35** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

# 21 КАСТРЫЧНІКА, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.05, 08.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.40** Навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка».
**10.05** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія).
**10.55** Меладраматычны серыял «Разумніца, прыгажуня» (Расія). 1-я серыя.
**12.10** Псіхалагічная меладрама «Іншая асоба» (Расія-Украіна).
**14.00** Відэафільм АТН «Дзяржынская пастараль» цыклу «Зямля беларуская».
**14.15** Клуб рэдактараў.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультфільм «Ну, пачакай!».
**15.55** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**16.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**17.55** Меладраматычны серыял «Разумніца, прыгажуня» (Расія). 2-я серыя.
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00** Драма «Вавілон» (Францыя-ЗША-Мексіка).
**00.50** Дзень спорту.
**01.00** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** Прэм'ера. «Паляўнічыя за дыяментамі». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.15** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі.
**23.30** «Наша Белараша».
**00.05** Прэм'ера. Фільм «Аднакласнікі».
**02.45** Начныя навіны.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Меншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Адплата». ЗША - Вялікабрытанія, 2010 г.
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Ашуканцы».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Турысты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Хірамант». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Добры дзень, доктар».
**17.20** «Меншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Студэнтка». Францыя, 1988 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Расійскія покерные турніры» («Russian Poker Series»).
**00.15** Фільм «Вялікая жратва 2». ЗША, 2009 г.
**01.50** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргенціна).
**09.05** Псіхалагічная драма «Кафедра» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
**11.35** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Лакаматыў - АЕК.
**13.30** Кінаспробы.
**14.00** Час футболу.
**14.45** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**15.05** Медычныя таямніцы.
**15.40** Камедыя «СВ. Спальны вагон» (СССР).
**17.25** Усё аб бяспецы.
**17.55** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргенціна).
**19.00** Фільм-фэнтэзі «Брама» (ЗША).
**20.45** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**21.00** «Калыханка».
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.15** Трылер «Слепата» (Канада - Японія - Бразілія).
**00.25** Канцэрт Chris Rea. Road to hell.

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Бумеранг з мінулага».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** Прэм'ера. «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Прэм'ера. «Юрмала - 2011». Фэст гумарыстычных праграм.
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** Фільм «Пара гнядых». 2009 г.

НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «І зноў добры дзень!».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Вочная стаўка».
**11.15** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Прэм'ера. «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. «Экстрасэнсы супраць НТБ». Адмысловы праект.
**21.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Вяртанне».
**22.25** «КДБ супраць МУС» з цыклу «Казнакрады».
**23.35** Прэм'ера. Камедыя «Нашых б'юць».

EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**10.00** Тэніс. Турнір WTA. Масква (Расія). 1/8 фіналу.
**11.50** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA. Масква (Расія). 1/4 фіналу.
**15.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**16.00** Снукер. Players Tour Championship (PTC). Дзень 1-ы.
**19.00** Конны спорт. Агляд тыдня.
**19.30** Тэніс. «Матс поінт». Часопіс.
**20.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Браціслава (Славакія).
**21.00** Снукер. Players Tour Championship (PTC). Дзень 1-ы.
**00.00** Боўлінг. PBA тур. ЗША.
**01.00** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**01.15** Тэніс. Турнір WTA. Масква (Расія). 1/4 фіналу.
**02.30** Тэхнічны перапынак.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**07.35** Басаном па свеце (спазнаваўчая праграма).
**08.00** «Малая Масква», серыял: 1 серыя.
**08.45** «Сонечная дзіда», серыял: 8 серыя.
**09.15** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.40** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**10.10** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**10.20** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Катка», дак. фільм, 2010 г., Чэхія.
**11.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**12.05** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 4 серыя.
**12.50** «Euromaxx».
**13.20** «Сонечная дзіда», серыял: 8 серыя.
**13.45** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**14.10** Басаном па свеце (спазнаваўчая праграма).
**14.40** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Катка», дак. фільм, 2010 г., Чэхія.
**16.10** «Малая Масква», серыял: 1 серыя.
**17.00** «Між намі, буслямі», анімацыйны серыял для дзяцей: 7 серыя.
**17.25** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**17.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 4 серыя.
**18.50** Маю права.
**19.10** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Асабісты капітал.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**22.05** Невядомая Беларусь: «Гуканне вясны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**22.35** «Норд-Ост. Тэатр смерці», дак. фільм, 2003 г., Польшча.
**23.20** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**23.30** Аб'ектыў.
**23.55** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

# 22 КАСТРЫЧНІКА, СУБОТА

**07.00** Існасць.
**07.25** Добрай раніцы, Беларусь!
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.45** Канцэрт.
**10.15** Культурныя людзі.
**10.50** Серыял па выходных. «Сваты-4».
**12.10** Меладрама «Каханая жанчына механіка Гаўрылава» (СССР).
**13.45** «Зоркі «Кінашоку».
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**16.45** Дак. цыкл «Атлас «Дыскаверы»..
**17.40** Відэафільм АТН «Горад солі» цыклу «Зямля беларуская».
**18.00** Ваша лато.
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** «Славянскі базар-2011».
**21.00** Панарама.
**21.40** «Сваты-4». Камедыйны серыял.
**22.50** Крымінальны баявік «Перавознік» (Францыя-ЗША).
**00.30** 60-ы конкурс прыгажосці «Міс Сусвет-2011».

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Разумніцы і разумнікі».
**11.55** Новы «Ералаш».
**12.30** Прэм'ера. Фільм «Дазвольце цябе пацалаваць».
**14.20** «Хвіліна славы. Мары спраўджваюцца!».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. «Спартак Мішулін. Ён абяцаў вярнуцца…».
**17.20** Прэм'ера. «Адмысловае заданне».
**18.40** «Адзін супраць усіх».
**19.25** «Абмен жонкамі».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Здань оперы».
**22.45** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.25** «Што? Дзе? Калі?». Фінал.
**00.40** Фільм «Небяспечная камбінацыя».

**07.05** Мультыплікацыйныя фільмы.
**07.35** «Анфас».
**07.50** «Салдаты. Дзембельскі альбом» Серыял.
**09.35** «Чыстая праца».
**10.20** «Мінск і мінчане».
**10.55** Фільм «Студэнтка». Францыя, 1988 г.
**12.55** «Прыгоды дылетанта».
**13.30** Фільм «Беражыся аўтамабіля». СССР, 1966 г.
**15.25** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Муж на гадзіну». Расія, 2007 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Выспа праклятых». ЗША, 2010 г.
**22.40** «Зорны рынг».
**23.55** «Покер дуэль».
**00.40** Фільм «Бронсан». Вялікабрытанія, 2008 г.
**02.10** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**06.35** Шпіёнская драма «Ілжывая спакуса» (ЗША).
**08.55** Усё аб бяспецы.
**09.25** Жансавет.
**10.00** Дача здароўя.
**10.45** Тэлебарометр.
**10.50** Фільм-фэнтэзі «Брама» (ЗША).
**12.40** Серыял «Маргоша» (Расія).
**15.55** Хакей. КХЛ. Віцязь (Чэхаў) - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**18.25** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Ліверпуль - Норвіч Сіці. Прамая трансляцыя.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Тэлебарометр.
**21.35** Шпіёнская драма «Ілжывая спакуса» (ЗША).
**00.10** Камедыя «Вялікая жратва» (ЗША).

РОССИЯ

**07.00** Прыгодніцкі фільм «Таямніца залатой гары».
**08.15** Мультфільмы.
**08.35** «Юрмала - 2011». Фэст гумарыстычных праграм.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Пара гнядых». 2009 г.
**13.30** «Відавочнае-неверагоднае».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.55** Фільм «Родная кроў».
**17.35** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40** Прэм'ера. Фільм «Знайдзёныш-2». 2011 г.
**00.05** «Дзяўчаты».

НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Медыцынскія таямніцы».
**08.50** «Акадэмія прыгажосці».
**09.25** «Гатуем».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль-4».
**15.10** «Жаночы погляд».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Таямнічая Расія».
**17.20** «Вочная стаўка».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.25** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.05** «Руская сенсацыя». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.00** «Ты не паверыш!».
**23.00** «Апошняе слова».
**00.00** Фільм «Знайдзі мяне».

EUROSPORT

**09.30** Тэніс. Турнір WTA. Масква (Расія). 1/4 фіналу.
**10.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам-гігант. Зэльдэн (Аўстрыя). Спроба 1.
**11.45** Вось дык так!!!
**12.00** Тэніс. Турнір WTA. Масква (Расія). 1/2 фіналу.
**15.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам-гігант. Зэльдэн (Аўстрыя). Спроба 2.
**16.30** Снукер. Players Tour Championship (PTC). Дзень 2-і.
**00.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам-гігант. Зэльдэн (Аўстрыя). Спроба 2.
**01.00** Тэніс. Турнір WTA. Масква (Расія). 1/2 фіналу.
**02.00** Снукер. Players Tour Championship (PTC). Дзень 2-і.
**03.00** Тэхнічны перапынак.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 4 серыя.
**08.20** «Між намі, буслямі», анімацыйны серыял для дзяцей: 7 серыя.
**08.45** Калыханка для самых маленькіх.
**09.10** Госць «Белсату».
**09.25** Еўропа сёння.
**09.55** Маю права.
**10.15** Форум (ток-шоу): «Дырэктыва №4».
**10.55** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**11.25** Невядомая Беларусь: «Гуканне вясны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**11.55** Вагон.
**12.00** Еўропа сёння.
**12.30** «Між намі, буслямі», анімацыйны серыял для дзяцей: 7 серыя.
**12.55** Калыханка для самых маленькіх.
**13.20** Невядомая Беларусь: «Гуканне вясны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**13.50** Госць «Белсату».
**14.05** «Паваротныя», маст. фільм, 1994 г., Польшча.
**15.25** МакраФон: Канцэрт Змітра Вайцюшкевіча.
**16.00** Маю права.
**16.20** Вагон.
**16.30** ПраСвет.
**17.00** «Доктар Марцін», серыял: 7 серыя.
**17.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** Чаму дэмакратыя? 5 серыя: «Абед з прэзідэнтам».
**19.00** Зона «Свабоды».
**19.35** Вагон.
**19.40** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.15** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.30** Беларускія лёсы: «Сяргей Законнікаў», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Два на два (тэледыскусія).
**21.40** Суботні сеанс: «Вінаватыя сэрцы», драма, 1999 г., ЗША, ч. 1.
**23.05** «Норд-Ост. Тэатр смерці», дак. фільм, 2003 г., Польшча.
**23.35** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 8 серыя.
**00.20** Аб'ектыў.

ЦІКАВА

# СЛУЖБОВЫ РАМАН ЗАБАРОНЕНЫ

*Алег НОВІКАЎ*

**20 гадоў таму ў юрыдычную практыку ўвайшло слова «harassment», або, у перакладзе на нашу паўсядзённую мову, «сэксуальнае дамаганне на працоўным месцы». Усё дзякуючы маладой амерыканцы Аніце Хіл.**

Юрысты-гісторыкі лічаць, што на самай справе ўсё пачалося раней. У 1970-я гады было шмат судовых працэсаў, істцы якіх былі ахвярамі таго, што цяпер называецца «harassment». Аднак ні яны, ні іх адвакаты не жадалі выносіць смецце з дому. Юрысты баяліся звязвацца з тэмай сэксуальнага дамагання, ды яшчэ вербальнага характару, паколькі часта гэта было нормай тагачаснай офіснай культуры. У шматлікіх офісах лічылася, што флірт боса з прадстаўніцамі персаналу — з’ява цалкам нармальная. Нават калі супрацоўніцы станавіліся ахвярамі больш адкрытай агрэсіі, яны намагаліся неяк ужывацца ў новых складаных умовах, каб не страціць працоўнае месца.

Між тым, калі верыць псіхолагам, нават такія бяскрыўдныя рэчы, як непрыстойныя анекдоты з падтэкстам, маюць сур’ёзны ўплыў на жаночую псіхіку. «Галаўны боль, праблемы са сном, падвышаны ціск, нервовыя зрывы, пачуццё безабароннасці — далёка не поўны пералік непрыемнасцяў ахвяр дамаганняў. Сэксуальнае дамаганне таксама адмоўна ўплывае на працоўную дзейнасць ахвяр, што можа выяўляцца ў пагаршэнні ўмоў працы, павелічэнні працоўных гадзін, аб’ёму працы, у несправядлівых адзнаках ці абвінавачваннях. Пацярпелая можа быць звольненая, падпасці пад дысцыплінарныя пакаранні — помста начальніка не ведае межаў. Нават пасля таго, як пацярпелая жанчына пакідае сваё працоўнае месца, начальнік можа сапсаваць ёй перспектывы далейшага працаўладкавання, забяспечыўшы дрэннымі рэкамендацыямі», — піша адзін з жаночых часопісаў.

Дамову маўчання наконт сэксуальнага дамагання прарвала маладая чарнаскурая юрыстка Аніта Хіл. У 1991 годзе яна заявіла, што была аб’ектам сэксуальных дамаганняў з боку свайго боса Кларэнса Томаса, дырэктара аднаго з дэпартаментаў Мінадукацыі. Па яе словах, суддзя прымушаў яе ўдзельнічаць у размовах пра сэкс, абмяркоўваць парнаграфічныя фільмы, распавядаў пра сваю вялікую мужчынскую моц. Усё з яўнымі намёкамі на ложак.

Паколькі сам Томас на той час па ініцыятыве прэзідэнта Джорджа Буша балатаваўся на пасаду сябра Вярхоўнага суда ЗША, заявы міс Хіл мелі гучны рэзананс. Уся краіна падзялілася на прыхільнікаў і праціўнікаў Хіл. Эмоцыі даходзілі да таго, што ананімныя фанаты Кларэнса Томаса пагражалі Аніце забойствам.

Хіл, між тым, выклікалі ў Сенат і пачалі дапытваць. Яна пагадзіла прасці тэст на дэтэктары хлусні. Томас адмовіўся праходзіць падобны тэст, аднак прывёў у Сенат масу сведак, якія казалі, што ён не здольны на такія рэчы, як абмеркаванне сцэнаў парнаграфічных фільмаў. Так, ніводная з 12 сакратарак, з якімі ён працаваў раней, не мела з ім праблем у галіне інтымных адносін.

У выніку галасавання ў Сенаце, дзякуючы рэспубліканскай большасці, Кларэнс Томас стаў сябрам Вярхоўнага суда. За яго галасавалі 52 са 100 сенатараў.

На той час, адпаведна апытанням, большасць амерыканцаў былі на баку Томаса.

Аднак гісторыя на гэтым не закончылася. Смелы крок Хіл падштурхнуў іншых ахвяраў сэксуальных дамаганняў пайсці яе шляхам. Сама Аніта Хіл прызнавалася, што была ў шоку. «Тое, што адбылося пазней, было для мяне татальным сюрпрызам. Мае прызнанні справакавалі нешта іншае, чым тое, пра што я думала. Людзі пачалі гаварыць пра сэксуальную дыскрымінацыю. Пераломным стаў той факт, што ўзнікла сама такая тэма, якой цяпер не трэба было саромецца. Тое была сапраўдная рэвалюцыя, паколькі да гэтага моманту мы толькі ўвесь час паўтаралі самі сабе: «Трымай вусны зачыненымі і проста рабі сваю працу».

У 1998 годзе Вярхоўны суд ЗША прыняў у сваім родзе гістарычнае рашэнне пра так званую «падвышаную адказнасць» працадаўцаў: гэта значыць, калі ў начальніка паўставала амурная калізія ў офісе, то ён ішоў наўпрост на міннае юрыдычнае поле.



**Феномен сучаснай карпаратыўнай Расіі палягае ў тым, што для жанчын сам факт сэксуальнага інтарэсу з боку начальніка не носіць негатыўнай афарбоўкі**

У выніку барацьба з «harassment» цалкам змяніла працоўную культуру краіны. У ЗША цяпер у сярэднім у год рэгіструецца да 12 тысяч такіх пазоўных заяў, звязаных з тэмай «harassment». Што характэрна, няўхільна расце лік скаргаў ад мужчын, якія вінавацяць босаўжанчын у сэксуальным дамаганні. У 2007 годзе колькасць іх склала 16 працэнтаў ад агульнай колькасці заяў. І як мяркуюць эксперты, па меры далейшай фемінізацыі класа начальнікаў тэндэнцыя будзе толькі ўзмацняцца. А колькі спраў не даходзіць да суда, будучы ўрэгуляванымі канвертамі з адпаведнымі сумамі, не ведае ніхто.

Ёсць шмат людзей, якія крытыкуюць Аніту Хіл за тое, што яна выпусціла джына з бутэлькі. Цяпер на працоўным месцы трэба быць вельмі асцярожным. Адзін з нашых суайчыннікаў, які працаваў у ЗША, распавёў тыповую гісторыю пра іх норавы. «На днях у нашым калектыве здарылася жудаснае ЧП. Начальнік, мужчына каля 50 гадоў, падышоў да супрацоўніцы, якая сядзела за кампутарам. Нахіліўся, каб разглядзець штосьці на маніторы, і выпадкова паклаў ёй руку на плячо. На наступны дзень у камісіі аддзела кадраў па этыцы ляжала скарга супрацоўніцы. Каб не даводзіць справу да суда, начальніку прапанавалі напісаць заяву пра сыход «па ўласным жаданні».

Ёсць думка, што перасслед сэксуальных дамаганняў разбурае працоўную атмасферу. Быццам службовыя раманы, наадварот, павялічваць ККД працы аддзелу або фірмы.

Дарэчы, некаторыя феміністычныя арганізацыі таксама не ў захапленні ад ідэй Аніты. На іх думку, тэорыя сэксуальнага «harassment» замацоўвае ў свядомасці штучны вобраз жанчыны як нейкай далікатнай істоты, якой патрэбна пратэкцыя. Па іх словах, калі жанчына будзе паводзіць сябе не як бландзінка, то да яе і так ніхто не палезе.

Такім заакіянскім ахвярам кампаніі супраць сэксуальнай дыскрымінацыі можна параіць адно — набудзьце квіток у адзін канец у Расію або іншую немусульманскую краіну СНД. Тут выпадкаў «harassment» таксама хапае. Па дадзеных апытання адмыслоўцаў, кожная чацвёртая жанчына ў расійскай правінцыі і кожная трэцяя ў Маскве і Пецярбургу падпадала пад сэксуальныя дамаганні на службе.

Аднак стаўленне да гэтай з’явы часта іншае. Наадварот, як кажа адна расійская феміністка: «Феномен сучаснай карпаратыўнай Расіі палягае ў тым, што для жанчын сам факт сэксуальнага інтарэсу з боку начальніка не носіць негатыўнай афарбоўкі. Тут, маўляў, няма чаго саромецца, наадварот, гэта знак выбранасці, прамы шлях у «касту недатыкальных».

І эрозія маралі ў грамадстве тут не пры чым. Сваю ролю адыгрывае працоўны менталітэт. «На Захадзе ў офісе проста працуюць, пакідаючы асабістае на вечар. Праца — сацыяльная тэрыторыя, дзе чалавек выконвае пэўную функцыю, абумоўленую патрабаваннямі і іншымі ўмовамі. Чалавек на працы выяўляе сябе як сацыяльная адзінка, а не як жанчына ці мужчына. Гэта розныя сферы жыцця, — тлумачыць часопіс «Итоги». — Мы жблытаем асабістыя адносіны і сацыяльныя. Нідзе больш так не прыходзяць на працу, як у другую сям’ю, як у нас».

Аднак, відавочна, што рана ці позна і ў нас з’явіцца наша Аніта Хіл.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Прэс-канферэнцыя Лукашэнкі для прадстаўнікоў расійскай прэсы працягвалася каля чатырох гадзін. Беларускі прэзідэнт выказаўся па шматлікіх праблемах унутранай і міжнароднай палітыкі, распавёў пра сваё разуменне сучасных тэхналогій. Але аналітыкі адзначаюць, што з кожным разам памяншаецца колькасць прадстаўнікоў цэнтральных і ўплывовых расійскіх выданняў, якія ўдзельнічаюць у прэс-турах, што арганізуюцца Мінскам.

**«BBC» (Вялікабрытанія)**

Эканамічная сітуацыя паўплывала і на танальнасць выказванняў Лукашэнкі. Падчас прэс-канферэнцыі для расійскіх журналістаў Аляксандр Лукашэнка паўтарыў свае традыцыйныя замовы пра незалежнасць знешняй палітыкі краіны як ад Расіі, так і ад Еўропы, аднак ад рэзкіх і абразлівых заяў устрымаўся. Кажучы пра расійскі вектар, быў і зусім вельмі талерантны. Лукашэнка заявіў пра поўнае паразуменне з расійскім кіраўніцтвам. Пра тое, што ён падтрымае перадвыбарную інтэграцыйную ініцыятыву Уладзіміра Пуціна ў абмен на чарговыя прэферэнцыі. Нагадаем, што найважнейшай прыкметай роўнасці для беларускіх уладаў з’яўляюцца расійскія кошты на энерганосьбіты.

**«Независимая газета» (Расія)**

Аднак, увогуле, выступ Лукашэнкі не ўразіў. Былі тут і ранейшыя шлягеры пра тое, што «нам не жыць без сябра», і пра тое, што «мы не прадаемся». Былі і новыя рэчы. Напрыклад, Лукашэнка падтрымаў ідэю Уладзіміра Пуціна пра стварэнне Еўразійскага саюза. Але гэта былі словы на стары матыў пра раўнапраўе і роўны даход. Кудысьці знікла ранейшая экспрэсія, агонь. Кажуць, гэта складанае эканамічнае становішча ў краіне прымусіла Лукашэнку хай і не наступіць на горла ўласнай песні, але ўсё ж крыху змяніць танальнасць. Ён разумее, наколькі цяпер залежны і ад пазіцыі Масквы, і ад змены палітыкі Захаду ў адносінах да яго.

**«Голос России» (Расія)**

Пустое крэсла прадстаўніка Беларусі на варшаўскім саміце «Усходняга партнёрства» для Віктара Януковіча павінна было б стаць навочнай ілюстрацыяй таго, што можа чакаць у будучыні яго персанальна і Украіну. Міжнародная ізаляцыя, немагчымасць выехаць у краіны Еўрапейскага саюза і ў рамках таго ці іншага саміту паціснуць руку лідарам еўрапейскіх дзяржаў — знявага для палітыка. Гэтыя пачуцці сёння ў поўнай меры адчувае Аляксандр Лукашэнка, які стаў неўязным у краіны ЕС. У дадзеным кантэксце не выпадковая некалькі істэрычная рэакцыя беларускага прэзідэнта — пагроза выйсці з «Усходняга партнёрства». Зрэшты, праз пару дзён кіраўнік беларускага МЗС Сяргей Мартынаў паведаміў, што краіна захавае ўдзел у ініцыятыве «Усходняе партнёрства». Сёння гэта амаль адзіная сувязь Беларусі з ЕС.

**«Дзеркало тижня» (Украіна)**

Што да Беларусі, дык яе ўваходжанне ў новы саюз абсалютна выключана да таго часу, пакуль ва ўладзе застаецца прэзідэнт Лукашэнка: новая наддзяржаўная структура будзе сур’ёзнай пагрозай яго эканамічнай і палітычнай манаполіі на беларускай тэрыторыі. Акрамя таго, беларуская дзяржаўная мадэль цалкам супярэчыць заяўленым базавым каштоўнасцям новага саюза і таму будзе падлягаць абавязковаму дэмантажу. Уваходжанне Беларусі ў Еўразійскі саюз магчымае толькі праз сур’ёзныя сацыяльна-эканамічныя рэформы. У сувязі з гэтым непазбежна паўстануць сур’ёзныя рызыкі — пераарыентацыя беларускай дзяржавы на інтэграцыю ў ЕС.

**«Регнум» (Расія)**

Пакуль беларускаму лідару не прапануюць пакінуць сваю пасаду, Еўропа прапанавала фінансавую дапамогу ў памеры 9 мільярдаў долараў у абмен на вызваленне палітвязняў і правядзенне справядлівых выбараў у адпаведнасці з заходнімі стандартамі. Гэтыя грошы паступяць у выглядзе пазык двух еўрапейскіх банкаў: Еўрапейскага інвестыцыйнага банка і Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця праз МВФ. Еўрасаюз своечасова выступіў са сваёй прапановай, калі Беларусь ахапіў глыбокі эканамічны крызіс, аднак Лукашэнка не выявіў да яе ніякай цікавасці.

**«El Pais» (Іспанія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ШВЕЙЦАРЫЯ. ДАЛОЎ СЦЯГ КРЫЖАКОЎ!

Група адвакатаў Швейцарыі, якая складаецца з мусульман, запатрабавала змяніць сцяг краіны. Белы крыж на чырвоным фоне, аказваецца, абражае пачуцці вернікаў іншых рэлігій і выклікае паралелі з крыжовымі паходамі. Узамен турэцкія і албанскія мігранты (іх у Швейцарыі каля 400 тысяч пры 7-мільённым насельніцтве) прапанавалі сцяг рэспублікі Гельвецыя (зялёная, чырвоная і жоўтая гарызантальныя паласы). Першым прапанаваў прыбраць крыж са швейцарскага сцяга віцэ-прэзідэнт асацыяцыі мігрантаў Івіца Петрушыч. «Крыж не падыходзіць для цяперашняй Швейцарыі», — абвясціў эмігрант з былой Югаславіі. Ідэя Петрушыча знайшла шырокую падтрымку сярод мігрантаў. Зялёна-чырвона-жоўты сцяг быў у кантонах дзяржаўным падчас акупацыі Швейцарыі напалеонаўскай Францыяй.

**Паводле французскай прэсы**

### УКРАІНА. ЯНУКОВІЧ КАНСАЛІДУЕ НАЦЫЮ?

«Ідэя Уладзіміра Пуціна пра стварэнне Еўразійскага саюза нясе пагрозу суверэнітэту Украіны, — піша ў новым выпуску кіеўскі часопіс «Тиждень», вядучы орган украінскіх нацыяналістаў. — Галоўнай патэнцыйнай ахвярай «пашырэння» Еўразійскага саюза можа стаць Украіна. Дадобна, Украіне варта чакаць новай, на парадак мацнейшай і, верагодна, больш «комплекснай атакі» з боку Крамля пасля таго, як яго зноў «афіцыйна» ўзначаліць Уладзімір Пуцін. Прычым наступ можа на гэта раз уключаць не толькі метады эканамічнага і палітычнага шантажу, аднак і больш агрэсіўныя правакацыі, напрыклад, спробы парушыць тэрытарыяльную цэласнасць і дэстабілізаваць агульную ўнутрыпалітычную сітуацыю ва Украіне». На думку выдання, агрэсіўныя ноткі з боку Расіі могуць дапамагчы адміністрацыі Януковіча кансалідаваць вакол сябе нацыю.

**Паводле ўкраінскай прэсы**

### ІРЛАНДЫЯ. ГОМАСЭКСУАЛІСТ, ФУНДАМЕНТАЛІСТ, ТЭРАРЫСТ

27 кастрычніка Ірландыя абірае прэзідэнта. Вызначыліся ўсе асноўныя кандыдаты. Выбіраць ірландцам давядзецца паміж незвычайнымі асобамі — гомасэксуалістам, былым тэрарыстам і каталіцкім фундаменталістам. Гомасэксуаліст — гэта неафіцыйны кандыдат ад лейбарыстаў, 67-гадовы Дэвід Норыс. Экс-тэрарыст — Марцін МакГінес, прадстаўнік левай нацыяналістычнай партыі «Шын Фейн». Ёсць яшчэ Гай Мітчэл, прадстаўнік правай партыі Fine Gael. Мітчэл праславіўся тым, што абараняў аднаго каталіцкага фанатыка з ЗША, якога адправілі на электрычнае крэсла за забойства ўрача, які рабіў жанчынам аборты. Норыс засвяціўся ў кантактах з 15-гадовым арабскім хлопчыкам з Палесціны. Што тычыцца МакГінеса, то на яго вялікага кампрамату няма, калі не лічыць таго, што ён быў тэрарыстам і сядзеў за кантрабанду выбуховых рэчываў.

**Паводле іспанскай прэсы**

### РАСІЯ. КАЛІНІНГРАД ЗНОЎ СТАНЕ КЁНІГСБЕРГАМ?

Губернатар Калінінградскай вобласці Мікалай Цуканаў не выключае, што ў Калінінградзе будзе арганізаваны рэферэндум наконт вяртання гораду гістарычнай назвы — Кёнігсберг. Пра гэта ён казаў падчас саміту «Усходняга партнёрства» ў Варшаве. Пры гэтым ён лічыць, што моладзь падтрымае гэтае рашэнне, а вось старым людзям будзе цяжка прыняць новую назву. Гэта не першы сігнал ад мясцовых уладаў наконт магчымай тапаграфічнай рэформы. У 2009 годзе старшыня адміністрацыі Калінінграда Фелікс Лапін таксама выступаў за вяртанне назвы Кёнігсберг.

**Паводле ўкраінскай прэсы**

### ГЕРМАНІЯ. ВЯЛІКАЯ КААЛІЦЫЯ ВЯРТАЕЦЦА?

Сацыял-дэмакратычны бургамістр Берліна Клаус Воверайт заявіў пра правал перамоваў з Зялёнымі наконт стварэння сумеснага ўраду. Такая кааліцыя таксама павінна была акрэсліць намер абедзвюх партый стварыць агульны федэральны ўрад пасля выбараў у Бундэстаг у 2013 годзе. Аднак у выніку міжпартыйная кансультацыя праваліліся. Вядома, што бакі пасварыліся наконт праекту будаўніцтва аўтабана, супраць якога выступаюць экологі. Так ці інакш, цяпер Воверайт павінен шукаць новага партнёра. Выбар невялікі: акрамя Зялёных патрэбную колькасць мандатаў могуць даць толькі хрысціянскія дэмакраты. Як піша прэса, такая схема падрывае давер паміж Зялёнымі і эсдэкамі ў кантэксце выбараў 2013 года. Такім чынам, не выключана, што Германіяй праз два гады зноў будзе кіраваць «вялікая кааліцыя».

**Паводле нямецкай прэсы**

### КАЗАХСТАН. ЧАСОВА ЗАБАРОНЕНАЯ КАМПАРТЫЯ

Дзейнасць апазіцыйнай Кампартыі Казахстана забаронена на паўгода. Такое рашэнне прыняў спецыялізаваны міжраённы адміністрацыйны суд Алма-Аты. Асноўная прычына — удзел кіраўніка партыі Газіза Алдамжарава ў незарэгістраваным аб'яднанні «Народны фронт». Лідар партыі Алдамжараў лічыць гэта рашэнне суда палітычна матываваным. «Па меры абвастрэння сацыяльнай сітуацыі людзі ўсё больш звяртаюцца да Кампартыі. Камуністы выяўляюць салідарнасць з бастуючымі нафтавікам, якія патрабуюць справядлівай заработнай платы», — кажа ён. На думку журналістаў, існуе небяспека таго, што Кампартыя Казахстана можа быць урэшце ліквідавана. Па казахскіх законах, калі партыя не прыме ўдзелы ў парламенцкіх выбарах тры разы запар, то яна можа быць забаронена. Камуністычная партыя Казахстана не прымала ўдзелы ў папярэдніх двух парламенцкіх выбарах.

**Паводле казахскай прэсы**

---

**ВЫБАРЫ**

# ПАЛЯКІ ЎЖО НЕ ХОЧУЦЬ БОЛЬШАГА

*Алег НОВІКАЎ*

**Ці значыць правал польскага Саюза левых дэмакратаў на апошніх выбарах канец посткамунізму ва Усходняй Еўропе?**



Гжэгаш Наперальскі

Гжэгаш Наперальскі, лідар Саюза левых дэмакратаў (SLD), паведаміў пра тое, што сыходзіць з пасады кіраўніка. Іншага цяжка было чакаць. Яго партыя правяла найгоршую, на думку назіральнікаў, кампанію ў сваёй гісторыі. Як вынік — мізер галасоў на выбарах 9 кастрычніка — 8 працэнтаў. Для параўнання, 10 гадоў таму SLD мела падтрымку ў 41 працэнт.

Тым больш крыўдна, што галасы левых перацягнула на сябе не якая-небудзь салідная структура, а папуліст. Гаворка пра мільянера Януша Палікота, які дзякуючы асабістай харызме і іміджу антыклерыкала дабіўся сенсацыйнага поспеху. Рух Палікота стаў трэцяй партыяй у Сейме, і нават можа ўвайсці ў склад новага кабінету «Грамадзянскай платформы» (PO), якой для фармавання ўраду не хапае ўсяго некалькі дзясяткаў мандатаў.

«Поспех Палікота робіць маштабы катастрофы яшчэ большымі. Самая простая калькуляцыя сведчыць, што менавіта электарат SLD, а не PO перайшоў у лагер люблінскага палітыка (Януш Палікот паходзіць з Любліну)», — піша адзін з інтэрнэт-парталаў.

Сам Наперальскі і яго прыхільнікі спісваюць правал на тэхнічныя недахопы, кшталту прымітыўнай лагістыкі і слабага піяру. Па словах шэфа SLD, «у выбарах вялікую ролю адыграла фігура лідара. Так было з Яраславам Качынскім, Дональдам Туском і Янушам Палікотам. Саюз левых дэмакратаў стратэгію не паспеў адбудаваць».

Крытыкі Наперальскага бачаць прычыны правалу ў няздольнасці аналізаваць тэндэнцыі і тактычна іх выкарыстоўваць. Апошнім часам на левым флангу «Грамадзянскай платформы» або каля яе круцілася шмат ініцыятыў, якія Саюз левых дэмакратаў не здолеў своечасова інтэграваць у левацэнтрысцкі бок. Затое зараз лідараў тых груповак можна знайсці ў спісе сяброў фракцыі Палікота.

Таксама відавочна, што ў SLD дамінуе ліберальная групоўка Кваснеўскага—Мілера, якія фантазавалі пра ўваход пасля выбараў у кааліцыйны ўрад з ліберrepresenting. Адсюль дамова з Business Centre Club — аб'яднаннем польскіх прадпрымальнікаў — наконт каардынацыі ў выпадку прыходу Саюза левых дэмакратаў да ўлады. SLD стаў першай партыяй Польшчы, якая падпісала падобны дакумент, які наўрад ці выклікаў эйфарыю ў левага выбаршчыка.

Увогуле, тэзіс пра слабы піяр SLD спрэчны. Левая дэмакратыя, наадварот, папрацавала вельмі творча. Безумоўным рэкардсменам сярод рэкламных партыйных ролікаў па колькасці праглядаў быў ролік Катажыны Ленарт, кандыдаткі ад левых дэмакратаў з Любліну. Дзяўчына здымала з сябе адзенне. Калі працэс даходзіў да споднягa, ролік перарываўся надпісам: «Хочаш большага? Галасуй за SLD».

Аднак нягледзячы на вялікую папулярнасць роліка ў youtube, у выніку чамусьці аўдыторыя не «захацела большага». Посткамунізм як палітычны накірунак усё менш запатрабаваны ў Польшчы. Усё менш становіцца пенсіянераў, якія мараць пра вяртанне камуны. З іншага боку, новая прагрэсіўная частка грамадства неяк асцярожна ставіцца да партыі, касцяк якой, нягледзячы на левую рыторыку, складаюць алігархі.

Намер сядзець на двух крэслах — адначасова казаць, што не так ужо кепска было ў савецкія часы, і падтрымліваць гей-прайды, не спраўдзіўся. І гэта не толькі польская з'ява. Паўсюдна ва Усходняй Еўропе партыі, створаныя на базе былых камуністаў, знаходзяцца ў крызісе.

У Балгарыі Сацпартыя (былыя камуністы) мае ў парламенце толькі 36 месцаў з 240. Створаная ў 1989 годзе на базе Венгерскай сацыялістычнай працоўнай партыі, Сацпартыя сабрала ў мінулым годзе на выбарах 19 працэнтаў (у 2006-м было 49). Апошні правал партыі Левыя (нашчадкі камуністаў ГДР) на выбарах у Берліне (11 працэнтаў) увогуле разглядаюць як прадвесце хуткага сыходу партыі з першага эшалону нямецкай палітыкі.

Тэма крызісу посткамунізму даўно была тэмай дэбатаў. А катастрофа на выбарах 9 кастрычніка паставіла пытанне рубам: ці быць SLD увогуле?

Ёсць, праўда, яшчэ аптымісты. Яны кажуць, што ўсё вернецца. Трэба толькі дачакацца, калі разваліцца праект Палікота, чый поспех, быццам, фрагментарны. Тым больш, што існуе гістарычны прыклад: у свой час «Самаабарона» — партыя Анджэя Лепера — таксама нечакана стала трэцяй партыяй у Сейме. Аднак пасля быў шэраг карупцыйных скандалаў, крымінальная справа супраць Лепера за сэкс з сакратаркай, развал фракцыі. Партыя фактычна перастала існаваць, а сам Лепер закончыў жыццё самагубствам.

SLD не губляе надзеі на тое, што Палікот праваліцца не толькі як арганізацыйны, аднак і левы праект. Сам Палікот вядомы як вялікі прыхільнік радыкальнай дэрэгуляцыі польскай гаспадаркі.

Аднак існуе пэўнае адрозненне паміж Рухам Палікота і «Самаабаронай». Гэта іх сацыяльная база. За «Самаабарону» галасаваў пакрыўджаны шокавай тэрапіяй малы чалавек. Палікоту аддае галасы моладзь і сярэдні клас. «Партыя тынэйджараў і багатых геяў» — называюць Рух Палікота яго праціўнікі. Акрамя таго, сярод палікотаўцаў ёсць дастаткова аўтарытэтных асобы, як, напрыклад, левы палітолаг Ванда Навіцка або антыклерыкальны актывіст Раман Катлінські. З улікам гэтых фактараў структура Палікота можа падтрымліваць сваю дынаміку яшчэ як мінімум пару электаральных цыклаў (як, дарэчы, калісьці і «Самаабарона»). Гэтага часу хопіць, каб SLD канчаткова маргіналізавалася.

Увогуле, мала хто верыць, што сімпатыі левых палякаў вернуцца да SLD без рэформаў унутры партыі. Калі гаворка ідзе не пра касметычны рамонт, то павінна адысці ад кіраўніцтва групоўка Кваснеўскага—Мілера, адказная за негатыўны імідж арганізацыі.

Таму некаторыя левыя заклікаюць не губляць час, а ўжо сёння думаць пра роспуск Саюза левых дэмакратаў і стварэнне новага левага полюсу. «Час распусціць SLD і закласці новае аб'яднанне. Калі такой змены не будзе, то левыя выбаршчыкі будуць хутка абіраць паміж чарговым нахабным фюрэрам з дзяжурнымі гаджэтамі, галасаваннем супраць усіх і папросту сядзеннем каля тэлевізару», — заклікае адзін з левых блогераў.

Больш асцярожныя прапануюць будучаму кіраўніцтву Саюза левых дэмакратаў проста правесці пазатэрміновы сход, распусціць структуру і адразу стварыць на яе базе новую партыю. Такі крок, маўляў, дапаможа зрабіць апгрэйд іміджу і падцягнуць новыя кадры.

Як бачым, варыянтаў, як выратаваць посткамунізм, хапае. Магчыма, нейкі і спрацуе. Калі не будзе справядлівы адзін сумны прагноз: вынікі апошняга галасавання сведчаць пра тое, то палякі ўвогуле гатовыя жыць без левых, нават сацыял-дэмакратычных партый. Ідэя пра тое, што можа існаваць альтэрнатыва далейшаму разбурэнню мадэлі сацыяльнай дзяржавы, падаецца ўтопіяй. Масамі авалодала думка: кожны сам за сябе. Адсюль перспектыва «амерыканізацыі» польскай палітыкі, стварэння двухпартыйная сістэмы па формуле: лібералы супраць кансерватараў, дзе левым, а тым больш посткамуністам, відавочна, няма месца.

СПРАВА

# ЧАМУ МАЎЧАЦЬ УКРАІНЦЫ?

**Нягледзячы на грамадскі шок, выкліканы суровым прысудам Юліі Цімашэнка, ніякіх масавых пратэстаў ва Украіне пакуль не назіраецца. Пра прычыны пасіўнасці людзей і наступствы прысуду журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з кіеўскім палітолагам Юрыем Дакукіным.**



***— Ці чакалі ўкраінцы такога суровага прысуду?***

— Здаецца, не. Інакш публіка б не рэагавала так эмацыйна. Усё ж сярод людзей, і нават аналітыкаў, панавала думка, што суд над Цімашэнка — асабістая помста або акцыя запалохвання апазіцыі напярэдадні ацяплільнага сезону, калі растуць кошты на камуналку і, адпаведна, павялічваюцца пратэстныя настроі. Прычым помста ці акцыя вельмі кепска зробленая. Я кажу пра юрыдычныя нонсэнсы і працэсуальныя хібы. Акрамя таго, у Пячэрску (урадавы квартал Кіеву) напярэдадні прысуду актыўна абмяркоўвалі дамову пра свабодную зону гандлю з ЕС, які ад пачатку патрабаваў вызваліць Юлію. Нават блізкая да Партыі рэгіёнаў прэса прагназавала ўмоўны тэрмін.

***— Вы кажаце пра эмацыйную рэакцыю грамадзян на прысуд, аднак акрамя сутычкі на Хрэшчаціку ніякіх пратэстаў не назіраецца.***

— Калі я кажу пра эмоцыі, я не кажу пра эмоцыі агрэсіі або помсты. Хутчэй, гэта праяўленне жалю. Пра магчымыя масавыя пратэсты ў дзень прысуду казала выключна апазіцыя, і тое адна з яе фракцый. Ніводны палітолаг, які сочыць за дадзенымі сацыёлагаў, не верыў у тое, што 11-га будзе новы Майдан. Выйсці на вуліцы на знак пратэсту супраць пакарання Цімашэнка гатовыя зараз 15 працэнтаў насельніцтва. Нават у Львове ніхто, акрамя пары вар'ятаў, не выйшаў пратэставаць. Прычына такой нізкай актыўнасці зразумелая: шмат хто разглядаў працэс над Цімашэнка як асабістыя разборкі паміж ёй і Януковічам. Тым больш, што Юлія звязаная з алігархамі, крыніцы яе багацця вельмі спрэчныя. Я маю на ўвазе яе былыя блізкія кантакты з алігархам Лазарэнкам. Ён сядзіць у ЗША за карупцыю. Шмат каму з людзей проста прыемна, што алігархі нарэшце хоць нейкім чынам трапляюць у турму.

***— Ці здольны апазіцыйны спектр, ад аранжавых да нацыяналістаў, аб'яднацца вакол лозунгу вызвалення Цімашэнка? Як адрэагавалі розныя сегменты апазіцыі на прысуд?***

— Калі апазіцыя не аб'ядналася падчас працэсу, думаю, што зараз яна дакладна не аб'яднаецца. Так, рэакцыя на турэмны арышт Юліі негатыўная. Лідар нацыяналістаў Алег Цягнібок увогуле заклікае да штурму прэзідэнцкай адміністрацыі. Аднак да вулічных пратэстаў, якія прызначаныя на гэтыя выходныя, заклікала толькі партыя Юліі «Батькивщина». У размовах «не пад дыктафон» шмат хто з апазіцыянераў прызнае, што адсутнасць Юліі на наступных выбарах у Вярхоўную раду можа дапамагчы іх перацягнуць яе галасы на свой бок.

***— Як вядома, Цімашэнка пакаралі за газавы кантракт з Расіяй, заключаны напярэдадні выбараў пазамінулага года. Быццам, ён быў на карысць Масквы, і, быццам, Цімашэнка была на адной назе з Пуціным. Ёсць версія, што пытанне вызвалення—пакарання Цімашэнка стане прадметам гандлю падчас высвятлення коштаў на газ.***

— Расійскай грамадскасці тэма Цімашэнка не зразумелая, і яна там мала каго цікавіць, тым больш на фоне падрыхтоўкі выбараў іх прэзідэнта. Рэакцыя будзе хіба што на ўзроўні ўлады. Хутчэй за ўсё, навіны з Кіева ўспрымуць як не вельмі прыемныя, аднак асаблівай істэрыкі на гэты конт не будзе. Як арыгінальна кажа Пуцін: «Сем гадоў для Цімашэнка? Сем? Сем — дарэчы, добрая лічба. А за што сем гадоў?» Гандляваць лёсам Цімашэнка падчас перамоваў аб газавых коштах маларэальна.

***— Калі пратэстаў за Цімашэнка не будзе, ці можа гэта развязаць рукі ўладам у барацьбе супраць палітычных апанентаў?***

— Пакуль такой асаблівай патрэбы няма. З усімі апазіцыйнымі палітыкамі, акрамя Юліі, можна было дамовіцца. У гэтым і спецыфіка сітуацыі. Выключна Цімашэнка з-за асабістай вендэты Януковічу ўяўляе ў выпадку вяртання да ўлады пагрозу для данецкага капіталу. Таму яе і цісніць. Таму і ніякага новага 1937-га года не будзе. Аднак яўнае прававое бязмежжа, якім характарызаваўся працэс супраць Цімашэнка, можа натхніць нашу судовую сістэму і сілавыя ведамствы на грэбаванне правам. І гэта вектар больш небяспечны для ўлады, паколькі закране шмат простых людзей.

***— Адпаведна прысуду, Цімашэнка выйдзе на волю толькі ў жніўні 2018 года, а вярнуцца ў палітыку (займаць месца ў дзяржаўных органах) зможа не раней за 2021-ы. На той час ёй будзе ўжо 65 гадоў. Ці значыць гэта, што ўкраінская палітыка развіталася з адным з самых яркіх сваіх персанажаў?***

— Некаторыя ўжо зрабілі фоташоп, як будзе выглядаць Юлія ў 65 гадоў, калі зноў паспрабуе выставіць сваю кандыдатуру. Аднак давайце ўзгадаем, які статус мае Хадаркоўскі ў расійскай палітыцы. І тое, што ён сядзіць на зоне, прычым вельмі далёка ад Садовага кальца, не перашкаджае яму быць палітычным акцёрам. Гісторыя ведае шмат прыкладаў, калі людзі, якія фармальна не ўдзельнічалі ў палітыцы, фактычна вызначалі трэнды. Можна згадаць тую ж Беназір Бхута, Леха Валенсу, Уга Чавеса, Нельсана Мандэлу. Усе яны кіравалі з-за кратаў. Не вельмі зручны, аднак практычны прыклад: Адольф Гітлер пасля Піўнога путчу таксама меў пасіўнае выбарчае права, аднак здолеў пабудаваць партыю і прывесці нацыстаў у Рэйхстаг. Будучы ў турме, Юлія застаецца значнай фігурай. Псіхалагічна яе зламаць, здаецца, не ўдалося. Пытанне ў тым, ці зможа яна тэхнічна кіраваць сваімі прыхільнікамі на волі.

***— Практычна кожная з вядучых украінскіх газет называла 11 кастрычніка пачаткам новай эры ў нацыянальнай гісторыі. Ці згодныя вы з гэтым?***

— У газетах зашмат патэтыкі. Аднак я раю пачакаць рашэння апеляцыйнага суда. Абсалютная большасць палітолагаў лічыць, што экс-прэм'еру яшчэ папсуюць нервы, аднак усё для яе складзецца добра. І прэзідэнт, дарэчы, ужо зрабіў знакавую заяву, што прысуд не з'яўляецца канчатковым. У гэтым сэнсе ідэальным варыянтам было б накіраваць справу на новае вывучэнне. Гэтым улада пакажа Захаду і ўкраінцам, што ў нас ёсць правасуддзе. Аднак у глабальным вымярэнні нічога амністыя не вырашае. Палітычнае жыццё Украіны зноў рызыкуе ператварыцца ў перманентнае асабістае супрацьстаянне Юлі Уладзіміраўны і Віктара Фёдаравіча, ад якога ўсе стаміліся. Вось ад гэтай формулы неяк трэба пазбаўляцца. Як? Не ведаю… Аднак не коштам сямі гадоў турмы для Юліі.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### АСЛАН МУСІН

Кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта Казахстана стаў героем скандалу пасля інцыдэнту ў Акадэміі мастацтваў Алма-Аты. Туды 3 кастрычніка была запрошаная яго жонка Гульбану. Падчас майстар-класа, які вяла Гульбану, адна са студэнтак гучна засмяялася. Гэта не спадабалася Мусінай, і на наступны дзень рэктар выдаў загад пра адлічэнне той студэнткі. Афіцыйная версія: дзяўчыну неяк бачылі, калі яна публічна цалавалася з адным са студэнтаў. Гэта, на думку рэктарату, супярэчыць прынцыпам казахскай культуры. У сваю чаргу, усе выкладчыкі ў нефармальнай абстаноўцы кажуць, што студэнтка стала ахвярай Мусінай. Хаця, магчыма, тут не абышлося без тыповага для чыноўнікаў падлізвання. Рэктар, які адлічыў дзяўчыну, у свой час праславіўся з-за таго, што адмовіўся ад свайго прозвішча Аліеў, не жадаючы асацыяцый з былым зяцем прэзідэнта Казахстана, які жыве ў эміграцыі і лічыцца лідарам антыназарбаеўскай апазіцыі.

### БАШАР АЛЬ-АСАД



Прэзідэнт Сірыі на сваёй старонцы ў Facebook заклікаў прыхільнікаў 9 кастрычніка сабрацца ў цэнтры Дамаску на флэшмоб у знак яго падтрымкі. Такім чынам гарант хацеў давесці, што ў Сірыі ёсць не толькі масавыя акцыі пратэсту супраць яго рэжыму. Флэшмоб атрымаўся. Некалькі дзясяткаў тысяч чалавек «спантанна» сабраліся ў цэнтры горада, каб прадэманстраваць палітычную лаяльнасць да ўлады. Яны крычалі: «Армія і народ з прэзідэнтам!» і «Сірыя — наша краіна, а Аль-Асад — наш прэзідэнт!». Асобна дэманстранты выказвалі падзяку Кітаю і Расіі за тое, што гэтыя краіны ў ААН падтрымалі Дамаск «у яго барацьбе супраць змоўшчыкаў». Застаецца дадаць, што на мінулым тыдні былі створаны Нацыянальны сірыйскі савет, які аб'яднаў прадстаўнікоў апазіцыі. Еўрасаюз вітаў яго ўтварэнне, а лівійскі паўстанцкі ўрад нават заявіў, што прызнае савет у якасці афіцыйнага ўраду Сірыі.

### УЛАДЗІМІР ПУЦІН

Прэм'ер Расіі і без пяці хвілін зноў прэзідэнт яшчэ раз пацвердзіў сваё лідарства ў тандэме з Мядзведзевым. Яму дапамагло выдавецтва «Facultet», якое да 8 кастрычніка — дня нараджэння кіраўніка ўраду — выпусціла кнігу-размалёўку для дзяцей, якая называецца «Вова і Дзіма». «Вову і Дзіму добра ведаюць усе дзеці Расіі. І зараз у кожнага дзіцяці ёсць магчымасць размаляваць жыццё Вовы і Дзімы самому», — напісана ў анатацыі размалёўкі. Малюнкі распавядаюць дзецям пра важныя справы Дзімы, які робіць людзей шчаслівей, і Вовы, да якога прыходзяць дзеці, і кожнаму ён дае мудрую параду. Але пры гэтым Вова і Дзіма ведаюць, што галоўнае ў жыцці — гэта сяброўства. Каментуючы выхад кнігі, аматары прыколаў раяць крамлёўскім паліттэхнолагам выкарыстаць верш Агніі Барто, напісаны ў далёкім 1957 годзе. «Мы сегодня в цирк поедем!/ На арене нынче снова/ С дрессированным Медведем/ Укротитель дядя Вова./ От восторга цирк немеет./ Хохочу, держась за папу,/ А Медведь рычать не смеет,/ Лишь сосет потешно лапу,/ Сам себя берет за шкирки,/ Важно кланяется детям./ До чего забавно в цирке/ С дядей Вовой и Медведем!»



УЛАДАРЫ ДУМАК

# Уладзімір Някляеў: СВЕТ

**Уладзімір Някляеў — паэт і палітык у адной асобе — цягам апошняга года ўвайшоў у топ медыйных персон краіны. Сёлета Беларускі ПЭН-цэнтр вырашыў вылучыць Някляева на атрыманне Нобелеўскай прэміі па літаратуры. Асоба гучная, спрэчная, яскравая — паэт Някляеў збіраў стадыёны слухачоў, палітык Някляеў не губляе надзею сабраць стадыёны прыхільнікаў. У працяг сустрэчаў у межах рубрыкі «Валадары думак» Уладзімір Някляеў наведаў рэдакцыю НЧ, каб паразважаць пра сумленне паэта, каштоўнасці сучаснага свету і персонаў, што займаюць пазіцыі маральных гуру сучаснікаў.**



Фота аўтара

Уладзімір Някляеў у рэдакцыі «Новага часу»

*Уладзімір Някляеў:* Я згодны з Валянцінам Акудовічам у тым, што ёсць памяншэнне ўплыву культуры на чалавека (рэд. — гутарка з Валянцінам Акудовічам, НЧ, №21, 27 мая, 2011 г.). Калі браць гады савецкага часу, то якія б ні былі прадстаўнікі культурнага асяродку, але яны ўсё ж давалі грамадству нейкія ўстаноўкі ў пошуках таго, як жыць і якія рашэнні прымаць. Сёння такой арыентацыі няма. Ёсць арыентацыя не на тых, хто мысліць, а на тых, хто думае. Гэта розныя працэсы. Думаеш увесь час пра што? Пра тое, як табе жыць. То бок мысліць чалавек пра быццё, а думае пра жыццё. Я не скажу, што свет бяздумны, ён проста стаў прагматычным. Цяпер валадарыць той, хто ў спісе Forbes. Даволі нечакана ў гэтым кантэксце праяўляюцца людзі, якія, будучы ў гэтым спісе, прэтэндуюць на званне валадароў думак. Я маю на ўвазе стваральніка Apple, які жыў так, быццам у яго і нямашака тых мільярдаў — не меў аховы, ездзіў на звычайных машынах і сыходзіў з тых пазіцый, што ў свой час навязалі яму валадары думак: што б ты рабіў, калі б жыў апошні дзень? — акурат тое, што трансляваў Гюго ды іншыя ў заходняй літаратуры і што прадукавалася ў савецкай літаратуры. Я бачу, як наогул культура падмяняецца цывілізацыяй і выдаецца як тоеснасць, хаця насамрэч гэта рознае. Скажам, узяць цывілізацыйную забаву футбол і культурніцкую забаву баі рымскіх гладыятараў. Баі гладыятараў — гэта кроў і не выглядае на культуру. Але калі ўзяць пасыл, то па духоўнасці, культуры гэта значна вышэй, чым футбольная дзея, за якой назіраюць сотні тысяч людзей. Простае пытанне: які ў гэтых людзей інтэлект?

***Аляксей Кароль: Паэт у Расіі больш чым паэт — фраза з пушкінскіх часоў. Якая роля паэта ў Беларусі — дасавецкай, савецкай і постсавецкай?***

*Уладзімір Някляеў:* Калі б я мог дамагчыся нейкіх вынікаў у мэце, што перад намі стаіць сёння, — змена ўмоў, у якіх мы жывём... Калі б я мог дасягнуць гэтага сродкамі культуры, то ніколі б не пайшоў у палітыку. Сённяшняя ўлада — з'ява антыкультурная. Мне як чалавеку трэба яе пераадолець.

Уплыў паэта ў савецкія часы і цяпер — непараўнальны. За савецкім часам была ўнікальная рэч, якой не было ні да таго, і, відаць, не будзе ўжо ніколі. Літаратурныя падмосткі ад Брэста да Сахаліна. Можна было выйсці з дому 1 студзеня і вярнуцца 31 снежня — ісці-ісці па гэтых літаратурных падмостках. Калі мне нешта і сніцца зараз добрае, то гэта літаратурныя стадыёны. Сніцца найперш праз эмоцыю, праз адчуванні, якія былі, калі стаіш на стадыёне і проста чытаеш вершы. Ты руку налева — дзесяць тысяч чалавек налева, ты руку направа — дзесяць тысяч направа. Хто гэтага не адчуваў, таму растлумачыць немагчыма...

***Аляксей Кароль: І тым не менш, гэтыя літаратурныя падмосткі ад Сахаліна да Брэста былі падкантрольныя. Крок улева-ўправа не дазваляўся.***

*Уладзімір Някляеў:* У Маскве былі некалькі людзей, якім дазвалялася тое, што іншым забаранялася, — Ахмадуліна, Вазнясенскі, Еўтушэнка, Раждзественскі. Ім дазвалялася адпаведная ступень крамолы. У Беларусі гэта быў Някляеў. Мне таксама дазвалялася значна больш, чым іншым. У першы раз я апынуўся ў КДБ амаль у дзіцячым узросце — было шаснаццаць гадоў, мяне як след напалохалі. Потым былі часы адлігі, 1960-я гады. У Мінску на ганку Тэатра юнага гледача мы збіраліся і чыталі вершы. Я прачытаў верш пра Жукава. Тады была сітуацыя, калі таварыш Хрушчоў пачаў прыбіраць таварыша Жукава. Ну, я і прачытаў «Як вам спіцца, таварыш Жукаў?!». Вось я і кажу чалавеку, які да мяне падышоў, што маршал Жукаў цяпер жа не такі, як быў. На што ён адказаў: «Тое, што Жукава можна асуджаць у Маскве, не значыць, што Жукава можна асуджаць у Мінску. Так што вы, юны паэт, глядзіце ў нас, не дзёргайцеся». Ужо тады я адчуваў, якая моц слова, мастацкага вобраза. Але людзі ішлі на стадыёны не за метафарамі паэтычнымі, а за метафарамі палітычнымі. Пачуць там тое, што нельга пачуць больш нідзе.

Аднойчы на стадыёне ў Маскве іранічны паэт Глазкоў прачытаў такія радкі:

*Люблю грозу в конце июня,*
*Когда в Москве идет парад,*
*И хмуро мокнет на трибуне*
*Правительственный аппарат.*

Людзі замерлі, хаця, па сённяшнім часе, што тут такога?

Ёсць страты ў нашым часе для літаратуры. Нямашака тых стадыёнаў, накладаў кніг.

У нас брутальная ўлада, якая лепіцца з людзей, падобных на таго, хто іх туды прыцягвае. Лукашэнка ніколі не цікавіўся аніякай літаратурай. На апошняй прэс-канферэнцыі ён развёў, што кніжка для яго — гэта абраз…Ніколі не забудуся, як у свой час таварышы-пісацелі імкнуліся перадаць яму свае кнігі. Дык цяпер хачу сказаць усім гэтым таварышам-пісацелям, што іх кніг ён не чытаў, памочнік іх нават не спрабаваў перадаваць. Калі чалавеку самому нешта не трэба, дык ён не разумее, навошта гэта іншым.

У літаратурных сустрэчах сённяшняй Беларусі забараняецца палітычны складнік. Калі б беларускі літаратар апрыёры не займаўся палітыкай, то ніхто б яго не чапаў. Некалі Лукашэнка мне казаў: «Перастаньце займацца палітыкаю! Што хочаце выдумвайце, голых рысуйце... Вы ж народжаныя, каб ствараць літаратуру, чаго вы сюды лезеце? А галоўнае, ты ж такія добрыя песні пішаш!..» Дык вось: каб я пісаў тыя песні, то ўжо невядома, колькі б зорак было на плячах. Адзіны жанр, які Лукашэнка «обожает» — гэта папса. На гэтым яго культурныя запатрабаванні сканчаюцца.

***Андрэй Расінскі: Вы распавядаеце пра культуру Лукашэнкі, яго каштоўнасці. Але ці не вінаватая ў гэтым у тым ліку і беларуская літаратура, у якой суцэльны лямант па вясковаму жыццю, крыкі пра беднасць?***

*Уладзімір Някляеў:* На сёння ўжо не так — новае пакаленне практычна ўвогуле пра гэта не піша. Не крычыць, не лямантуе. Беларуская літаратура творча вырасла, але, я б сказаў, не выявіла гнуткасці ў стасунках з тым, што прыўнёс Лукашэнка. Ну, не такі ён разумны, што нельга яго абдурыць. І не такі дурны, што і абдурваць яго не трэба... Памыляліся і тыя, хто адразу ўставаў у контру і не меў жадання гаварыць з ім. Ну і не гавары, ён знойдзе, з кім паразмаўляць. А нехта вырашыў пайсці да яго служыць з намерам даслужыцца да таго, што будзе магчымасць не толькі с...ку палізаць, але і ў вушка пацалаваць. Трэба было думаць і бачыць рэальнасць. Я разумеў, што гэта надоўга, што ў сітуацыі постсавецкага часу, калі чалавек з цвёрдым характарам атрымае ўладу, то і аддасць яе не хутка. І калі не будзе спосабаў забраць у яго ўладу, дык трэба неяк яго перайначваць, нешта з яго ляпіць. Я паспрабаваў, але там, ва ўладзе, і тут, у сваім асяродку, не знайшоў разумення. Хоць усе былі згодныя: трэба нешта рабіць — і хутка. Вось я і рабіў хутка, што мог.

Ведаеце, было фізічнае адчуванне: яшчэ трохі — і Беларусь знікне. Беларускія тэксты проста не будзе каму чытаць. Я паспрабаваў пазмагацца за тое, каб гэта змяніць.

Ёсць метафізічныя, сакральныя рэчы, якія больш важныя за ўсё матэрыяльнае. Для мяне яны, паміж іншым, у тым, як я дыхаю, як беларусы дыхаюць словамі. У беларускай мове закладзеная наймагутная энергетыка — і яна не скарыстаная. Не скарыстаць яе, не выпісаць уласна беларускія, кодавыя знакі — проста злачынства.

***Аляксей Кароль: Паэт і палітык — калі твой уплыў ты бачыш большым?***

*Уладзімір Някляеў:* Уплыў праз палітыку, на жаль, непараўнальна большы, чым праз літаратуру. Гэта звязана з тым, пра што я сказаў раней, са стратамі. І дагэтуль у людзей, якія чыталі тое, што я напісаў, ёсць агульнае з Лукашэнкам чаканне: калі ў Някляева пройдзе дурата, і ён пачне зноў пісаць песні? І шчыра ж кажуць: апроч вас ёсць у палітыцы Саннікау, Мілінкевіч, Калякін... На што я кажу: дык і ў літаратуры, апроч мяне, хапае народу.

***Аляксей Кароль: Прысутнасць у палітыцы забівае паэзію?***

*Уладзімір Някляеў:* Ой, гэта катастрофа — наяўнасць у мазгах палітыкі дзённа і ночна. Ёсць людзі, у якіх галовы арганізаваныя, як кампутар: ёсць дыск D і C, і яны ніяк адзін аднаму не замінаюць. А ў мяне адна мазгаўня, і, каб пераключыцца з палітыкі на літаратуру, мне трэба вытрасці з галавы ўсё, што там нагрувашчана. На гэта трэба час. Але што шкадаваць: не вядома, ці здолеў бы я за гэты час напісаць тыя тэксты, што хацеў. Усё ж у мяне ёсць нейкі час уначы. Я цяпер вярнуўся да таго рэжыму, што быў у мяне ў маладосці, не думаў, што ў маім узросце магчыма спаць па тры-чатыры гадзіны. Мы не ведаем сваіх магчымасцяў. Калі нешта трэба, то чалавек здольны на многае.

Прозу яшчэ магу пісаць паралельна з палітыкай, а што да паэзіі, то з палітыкай яна не перамешваецца. Хіба толькі ў турме напісаў паэму і вершы.

***Аляксей Кароль: І калі выйдзе з друку паэма?***

*Уладзімір Някляеў:* Я не спяшаюся. Хачу, каб у кнізе былі вершы, паэма, дзённікавыя запісы. І вельмі хораша на гэта кладуцца лісты да жонкі. Але жонка ніяк не пагаджаецца. Кажа: не, мой дарагі, не збіраюся я дзеля тваіх літаратурных прэтэнзій выварочваць інтымнае.

***Аляксей Кароль: Якія асабістыя страты і набыткі адчуваеш пасля таго, як злучыў у адной асобе паэта і палітыка?***

*Уладзімір Някляеў:* Набыў, што набыў: кайданкі і турму. У палітыцы нешта набыць можна толькі тады, як пераможаш. У астатнім гэта шлях стратаў. Дзякуй Богу, мне пашчасціла, што ў крэўным асяродку мяне не падверглі астракізму. Ні дзеці, ні жонка не паківалі мне пальцам за гэта. Калі

# НЕ БЯЗДУМНЫ...

адказваеш за сябе, гэта адзін стан, а калі яшчэ і за іншых... Учора вось тройчы прыходзілі да нас «супрацоўнікі», і не можаш жа ім дзверы не адчыніць. Але сяброў я страціў шмат, прычым такіх, якія, здавалася, на ўсё жыццё. Гэты факт найбольш сумны ў чалавечым плане. Не былі, значыць, яны сябрамі. Прычыны простыя: страх, асцярога, што з імі можа нешта здарыцца праз тое, што са мною маюць зносіны. Хто працаваў у дзяржаўных структурах, адскочылі яшчэ ў 1999 годзе, а цяпер і найбольш стойкіх ветрам здзьмула. Але, з іншага боку, небасхіл ачысціўся.

Калі сябра трапляе ў турму, дастаткова спытацца ў жонкі, ці ёсць грошы на хлеб. Гэтага дастаткова, каб пацвердзіць свае адносіны. Калі мы не будзем ва ўсім ставіць на першае месца чалавека, пра што нам, ёлкіматалкі, прапісана ў Нагорнай пропаведзі, нічога не будзе.

А ўсё астатняе… Я гатовы быў і разумеў, што мяне чакае. Па-сутнасці, я зрабіў некалькі памылак, і адна з іх вельмі вялікая. Гэта палітычная памылка, відаць, была абумоўленая маёй палітычнай недасведчанасцю. Я паверыў, бо надта актыўнай была палітычная праца ў будаванні мосту, пантону з Еўрасаюзам, якую праводзілі Міністэрства замежных спраў і Адміністрацыя прэзідэнта. Уся беларуская палітыка была скіраваная на будаўніцтва гэтага моста, я даволі падрабязна ведаў, што адбываецца ў гэтым кірунку. І прыйшоў да высновы, што сам сабе падкласці міну пад гэты мост Лукашэнка не можа. У выніку я не стаў клапаціцца пра бяспеку так, як было б варта. Гэта была самая істотная памылка, якая не дала рэалізаваць нам задуманае на Плошчы. На сённяшні дзень гэта самая пакутлівая для мяне рэч. Яна цяжкая яшчэ і таму, што я не шкадавальшчык па мінуламу, не вяртаюся назад. Дзве прычыны, з якіх я застаўся ў палітыцы. Многа людзей падпісаліся, прыйшлі на Плошчу, і сказаць ім: «Ведаеце, я трошкі пазаймаўся палітыкаю, а цяпер бывайце здаровы, пайду песні пісаць», — не выпадае.

***Аляксей Кароль: Першая прычына — дзяжурная, на яе многія палітыкі спасылаліся, а ў выніку сыходзілі, і электарат не бедаваў.***

***Уладзімір Някляеў:*** Размова не пра электарат, а пра канкрэтных людзей, якія прыходзілі да маёй жонкі і прыносілі слоік варэння ці кавалачак каўбасы. Лёгка любіць увесь свет і ўвесь электарат. Але толькі канкрэтныя людзі ведаюць, любіш ты іх насамрэч ці не.

Сёння мне сумна ў палітыцы. Я — чалавек Плошчы, стадыёна, прасторы. Палітычныя пасядзелкі, размовы аб шляхах дэмакратызацыі, офісная палітыка — гэта не для мяне. А нехта, наадварот, у гэтым як рыба ў вадзе. Устрапянуліся, паплылі, і з таго боку такія самыя карасі плывуць. У гэтым сэнсе ў літаратуры мне весялей.

***Аляксей Кароль: Паэтычны дар уплывае на маральнасць у палітыцы?***

***Уладзімір Някляеў:*** Безумоўна, уплывае, бо палітыка — рэч амаральная. Калі называць рэчы сваімі імёнамі, то ў барацьбе за ўладу размовы пра мараль няма. Палітыка — жорсткая рэч, у якой ёсць сродкі і мэта, тое, што ты паэт і прытрымліваешся выпрацаваных нормаў, замінае. Мы б паўсюль мелі лагеры і канцлагеры, калі б не было выпрацавана стрымліваючых інструментаў. І ўсе людзі ў гэтым аднолькавыя. Лукашэнка хацеў бы зрабіць тое, што Сталін, але не можа. Я кажу пра тое, што ўсякія рэфлексіі — філасофскія, гістарычныя — не могуць табе дапамагаць у занятках палітыкай. Іншая справа, што я не ўладалюбівы чалавек і камандаваць мне ніколі не прыносіла задавальнення. Праз гэта маю ўнутраны дыскамфорт: паводле сваёй сутнасці я б напляваў на ўладу, але, калі займаюся палітыкай, мушу да яе імкнуцца. У гэтым сэнсе я прайграю «чыстым» палітыкам. Праўда, у адносінах з людзьмі, якія прыходзілі да мяне на сустрэчы, гэта моцна дапамагала. «Мае людзі» выходзілі з залі з нейкім адчуваннем катарсісу, тое, чаго я заўсёды дамагаўся, хацеў, каб эмоцыя дайшла. І вось гэта дапамагае ў палітыцы.

***Андрэй Расінскі: Беларусь як такую пачалі ствараць паэты. А цяпер паэт прыйшоў у палітыку, ці не запозна?***

***Уладзімір Някляеў:*** Я прыйшоў, бо думаў, што вырашу пытанне ўлады на гэтых выбарах. Нібыта ўсё было — і ў сабе, і звонку. Прычына паразы — палітычная памылка. І, да слова, той год я пражыў не як паэт, а як палітык і рабіў практычна ўсё, каб перамагчы. А тое, што вы звязалі мяне з асобамі, якія распачыналі беларушчыну, то гэта з простай прычыны — вы пра гэта ведаеце. Я неадназначна распавядаў пра фарміраванне нацыянальнай ідэі. Раней гэта выклікала цікаўнасць, а цяпер пытаюцца, колькі будзе грошай. Змяніўся наш люд.

***Вольга Хвоін: Вы — тэатр аднаго актора, асобны чалавек стадыёна. А ў палітыцы акурат мусіць быць персона крыху іншага складу — дамоваздольная, якая ўмее ісці на кампрамісы, угоды, у тым ліку з сумленнем. У вас няма адчування, што вы не на сваім месцы?***

***Уладзімір Някляеў:*** Гэта першае, што мне ўсе хочуць давесці. Калі б я не ведаў, што насамрэч адбываецца ў гэтай палітыцы і як мы дасягаем гэтай самай еднасці, калі б быў перакананы, што як Някляеў сігане з палітыкі, так усе абдымуцца і разам — без мяне — адразу дойдуць да светлай мэты, дык толькі б мяне і бачылі. Але гэта не так. Някляеў сёння не прычына раздору, а апраўданне. От, у нас усе грады акучаны, ведаем, чым паліваць, а ён прыпёрся і нарабіў дзялоў, сродкі пазабіраў. Але я нікому не замінаў і праграму распрацаваць, і сродкі знайсці.

Праблема ў іншым, палітыкі таксама жывыя людзі, якія падпарадкаваныя тым жа эмоцыям і рэакцыям. Чалавек усёй сваёй істотаю скіраваны на перамогі. І ад поспеху да поспеху ён акрыляецца. Помню, як ішоў ад кніжкі да кніжкі — выйшла першая, я стаў на яе і вось ужо далей бачу. А беларуская апазіцыя ад 1991 года не мела перамог. Гэта прывяло да страшэннай падаўленасці, і ў такім стане людзі займаюцца тым, што ўвесь час шукаюць вінаватых. Гэта пошукі апраўдання сабе. І заўважце, я ніколі ні пра каго з апазіцыі не сказаў кепскага слова. Ні тут, ні ў Брусэлі ці Берліне. Для мяне ясна адно: ён на гэтым жа баку, што і я. У тым, што не дасягнуў поспеху на Плошчы, вінаваты сам. Не хацелася пра гэта гаварыць: тое, што сталася на Плошчы, было шмат у чым абумоўлена недахопам сродкаў. А сродкаў не хапіла, бо людзі, якія цяпер гавораць, што ў іх няма згоды праз Някляева, правалі вялікую працу. Але зноў жа, як бы там ні было, я мяркую, што мы маем не самых горшых палітыкаў. Проста пераламаць сітуацыю яны не могуць у тым ліку і таму, што іх не падтрымлівае грамадства. Бо грамадству нават у часы крызісу больш імпануе тое, што прапануюць улады. Пакуль што. І цяпер я займаюся чым? Тым, каб прапанаваць грамадству альтэрнатыву. Такую, каб грамадства не змагло ад яе адмовіцца. А гэта не толькі 9 мільярдаў долараў.

***Аляксей Кароль: Я б хацеў удакладніць: ёсць апазіцыя, якая ёсць, іншай яна не можа быць ва ўмовах пастаяннага ціску з прымяненнем рэпрэсій, адсутнасці палітычнага градуса ў грамадстве, слабасці нацыянальнай эліты. Але ёсць відавочнае — разуменне, што дзяліць няма чаго. І тым не менш аб'яднання не адбываецца, сабрацца і дамовіцца ў палітыкаў не атрымліваецца. Чаму?***

***Уладзімір Някляеў:*** Бо не хочуць на сённяшні дзень далучацца да чужых ініцыятыў. Я стаю на прынцыпе: калі які заўгодна рух пачынае дзейнасць, усе мусяць далучацца, стаяць на адной платформе і рабіць адно. Але хто ініцыяваў, той і робіць, а астатнія назіраюць. Патрабаванні, якія вылучае апазіцыя, не знаходзяць веры сярод людзей: уладай гэта не будзе выканана. Я даводжу на ўсіх сходах: скончыце крэатыўнічаць і выдумляць. Мусіць быць пастаўлена мэта — змена ўлады, і тады ўсе патрабаванні будуць выкананыя.

Не ўсё так проста і ў самой апазіцыі. Калі мы выпрацоўвалі план перад выбарамі, я не ведаў, каму гэта магу паказаць без асцярогі, што агучанае застанецца паміж мною і тым чалавекам. Я прапаноўваў іншым аб'яднацца вакол сілы, якая можа правесці кампанію, бо мае рэсурс. І што зрабіў Лукашэнка? Зарэгістраваў дзевяць кандыдатаў, што ў выніку моцна спрацавала супраць той альтэрнатывы, якую я зараз агучыў.

Я меркаваў, што на трэці дзень на Плошчы было б тысяч дзвесце людзей. Ёсць палітыкі, якія мне даводзяць, што я ідыёт, бо не мог не разумець — план правакацыі на Плошчы даўно быў прыдуманы на Лубянцы. Думаю, не. Усё ўзнікла спантанна ў момант, калі Лукашэнка адчуў небяспеку ад таго, як могуць развівацца падзеі. Іншага выратавання, апроч як брутальна разагнаць людзей, у яго не было. Мы не збіраліся трымаць людзей усю ноч. Усё мусіла адбыцца вельмі хутка: праводзім сход на плошчы Кастрычніцкай, абіраем камітэт за выбары без Лукашэнкі, гэтую паперчыну нясём да дома Урада і распускаем людзей. На заўтра людзі прыйшлі б за адказам, калі б былі не пабітыя. Практыка паказвае, што ў такім выпадку прыходзіць удвая больш людзей. На Плошчы заставалася б паўтары тысячы чалавек, гэта мы маглі б забяспечыць. І хаця я ўсё імкнуўся захаваць у таямніцы, у КДБ мне паказалі гэты план. Маўляў, думаеце, што вы вялікі сакрэтчык, то ў нас ёсць яшчэ большыя сакрэтчыкі.

***Вольга Хвоін: Колькі людзей ведала план?***

***Уладзімір Някляеў:*** (задумваецца, усміхаецца) Дастаткова, каб узніклі падазрэнні, што нехта з іх здаў.

***Аксана Колб: Ёсць Някляеўпаэт, які збіраў стадыёны. А ці можна чакаць гэтага ад Някляева-палітыка?***

***Уладзімір Някляеў:*** (паўза) Можна...

***Аляксей Кароль: Што цяпер адбываецца з кампаніяй «За праўду!»?***

***Уладзімір Някляеў:*** Па-сутнасці, толькі дзве структуры ў рэгіёнах не аднавіліся, бо іх кіраўнікі з'ехалі за мяжу. Калі людзі займаліся нечым маштабным, то потым яны не хочуць рабіць руцінныя справы. Я не хачу гэтага. Як я бачу сітуацыю сёння: калі ўсё будзе цягнуцца «не гарыць, не тлее», то можам зноў выйсці. Трэба, каб Еўрасаюз і мы самі падтрымлівалі нейкі рух. Не дай Бог нам зноў упасці ў спячку да чарговых прэзідэнцкіх выбараў.

***Вольга Хвоін: Я так разумею, што вы звязваеце ўсплёск палітычнай актыўнасці з парламенцкімі выбарамі, маеце намер самі балатавацца?***

***Уладзімір Някляеў:*** Чамусьці ўсе разумеюць удзел як абавязковую ўмову балатавацца. Парламенцкія выбары даюць масу варыянтаў. Але скарыстоўваць гэтую палітычную сітуацыю мы мусім. Калі б я сядзеў у турме, то, безумоўна, займаў бы такую ж пазіцыю, як Саннікаў і Статкевіч: ніякіх выбараў і перамоў з уладаю. Гэта натуральна. Але калі ты тут і разумееш, што інструментаў, каб вырашыць пытанне ўлады сёння і адразу няма, то трэба шукаць нейкія іншыя спосабы. У тым ліку і спробы размаўляць — гэта палітыка, бадай яе…

***Аляксей Кароль: Ці магчыма ўсё ж пэўнае адзінства дзеянняў у бліжэйшы час, пры тым, што саспяваюць пратэстныя настроі?***

***Уладзімір Някляеў:*** Як я адчуваю сітуацыю, палітыкі прыйшлі да гэтага. Ні на адной сустрэчы падчас саміту «Усходняга партнёрства» паміж намі не было збою ў агульным пасыле. З часу падаўлення снежаньскай акцыі ўсё істотна зрушылася, таму мне падаецца — гэта магчыма. Мяркую, у гэтым месяцы выпусцяць яшчэ некага са спісу палітвязняў, а да Новага года астатніх, інакш сэнсу ва ўсім гэтым няма. Калі вызвалення палітвязняў не адбудзецца, то з боку ЕС будуць уведзеныя рэальныя эканамічныя санкцыі. Чаму цяпер не разагналі Народны сход? Цяпер тут камісія МВФ, і менавіта гэта стрымлівае ўлады, бо МВФ будзе звяртаць увагу не толькі на эканамічныя аспекты.



Уладзімір Някляеў, Уладзімір Арлоў (справа) і Зміцер Вайцюшкевіч (злева) на пікеце пад час выбарчай кампаніі

▸ КАНЦЭРТ

# «НЕЙРА ДЗЮБЕЛЬ» ЗАПАЛІЎ «ГРАФІЦІ»

Мікіта БРОЎКА

**Нягледзячы на знаходжанне ў спісе забароненых, культавы беларускі рок-гурт здолеў даць традыцыйны канцэрт у клубе «Графіці», які здаўна застаецца ледзь не адзінай пляцоўкай для выступаў забароненых музыкаў.**



Як вядома, пасля з'яўлення новага «спісу забароненых» быў адменены не адзін канцэрт гурта. Дзіўным выключэннем з агульных правілаў быў толькі клуб «Графіці» — забароненыя музыкі традыцыйна давалі тут канцэрты. Але пачынаючы з 21 жніўня, калі быў запланаваны канцэрт Зміцера Вайцюшкевіча, і тут пачаліся адмены канцэртаў. Пасля Вайцюшкевіча была адмена выступу гурта «N.R.M.», а 29 жніўня быў адменены канцэрт «Нейра Дзюбеля».

Тады адміністрацыя клуба спасылалася на тое, што ў памяшканні будуць праводзіцца рамонтныя працы. У той час мала хто паверыў у гэта — сярод прыхільнікаў якаснай беларускай музыкі пачаліся размовы, што апошняя пляцоўка, адкрытая для выступаў забароненых музыкаў, знікла. Але зараз лідар «Нейра Дзюбеля» Аляксандр Кулінковіч кажа, што прычыны адмены не былі надуманымі: гэты канцэрт — пераканаўчае таму пацверджанне.

Клуб быў перапоўнены, і тое не дзіўна — «Нейра Дзюбель» даўно не выступаў, акрамя ўсяго, на канцэрт патрапілі тыя людзі, што набывалі квіткі на канцэрт 29 жніўня, які быў адменены. Пасля звычайнай для «Графіці» гадзіннай затрымкі канцэрт традыцыйна пачаўся песняй «Вітайце». Каб разварушыць публіку, «Нейра Дзюбелю» шмат часу не спатрэбілася — літаральна праз некалькі песень за столікамі не сядзеў амаль ніхто.

Перад канцэртам мне пашанцавала падглядзець спіс кампазіцый, якія гурт плануе выканаць: у ім значыліся 24 песні, у большасці з апошніх альбомаў. Але, вядома, гэтымі песнямі выступ не абмежаваўся. За амаль двухгадзінны выступ гурт здолеў давесці публіку да экстазу — час ад часу ў маленечкім «Графіці» ўзнікала нешта падобнае на слэм, і перасоўванне па клубе было значна замаруджанае. Публіка была па большасці сталая, і тое не дзіўна — моладзі зараз цяжка дазволіць сабе даволі нятанныя квіткі, кошт якіх можна параўнаць з сярэднім для замежных гуртоў у дакрызісныя часы.

Адыграўшы спісавую частку праграмы, Аляксандр Кулінковіч паспяшаўся сысці са сцэны разам са сваімі калегамі. Але публіка патрабавала выхаду на біс, і даволі незвычайна — увесь зал пачаў гучна распяваць песні гурта, а значная частка людзей настойліва крычала: «Са-му-ра-і, са-му-ра-і!», маючы на ўвазе адзін са старых гітоў гурта. Выхад на біс не прымусіў сябе доўга чакаць — музыкі нарэшце выйшлі на сцэну, а Аляксандр Кулінковіч пажартаваў, што граць яны будуць толькі за грошы. Публіка занадта літаральна ўспрыняла той жарт — хутка да лідара гурта пацягнуліся рукі з буйнымі купюрамі і нават доларамі.

Сам Аляксандр Кулінковіч такой рэакцыі не чакаў і пачаў адмаўляцца ад грошай. Але настойлівасці некаторых гледачоў было цяжка супрацьстаяць, таму трохі грошай музыкі вымушаныя былі ўзяць сабе і паабяцаць выкарыстаць іх на аплату рэпетыцый. Трохі пазней «Нейра Дзюбель» нарэшце выканаў «Самураяў» і яшчэ некалькі песень, пасля чаго канчаткова развітаўся з гледачамі. Але не ўсе гледачы спяшаліся разыходзіцца — прынамсі гадзіну пасля канцэрта ў грымёрцы фанаты набывалі майкі і дыскі, прасілі аўтографы і фатаграфаваліся з Аляксандрам Кулінковічам.

Зараз «Нейра Дзюбель» актыўна працуе над новым альбомам. Аляксандр Кулінковіч называе яго «самым няшчасным» у гісторыі «Нейра Дзюбеля» і кажа, што яго назва ўжо амаль зацверджана — новы альбом, хутчэй за ўсё, будзе называцца «Жаба». Матэрыял гатовы прыкладна на 60 працэнтаў, выпусціць альбом плануецца позняй восенню.

Бліжэйшы мінскі канцэрт гурта традыцыйна пройдзе 18 кастрычніка ў «Графіці». Праз некалькі дзён плануецца яшчэ адзін выступ: пад назвай «Kull Orchestra» гурт збіраецца прыняць удзел у штогадовым фестывалі «Рок па вакацыях», які мае адбыцца 21 кастрычніка ў клубе «Re:Public». Часовай зменай назвы гурт спадзяецца абысці так званы «чорны спіс» і нарэшце выступіць на вялікай пляцоўцы. А пасля фестывалю «Рок па вакацыях» запланаваны шэраг канцэртаў у Маскве — тут гурту давядзецца выступіць тройчы — 28 і 29 кастрычніка, а таксама 3 лістапада.



▸ ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# МАРС-РОК

**4 лістапада на музычных лэйблах «БМА» і «Vigma» адбудзецца рэліз новага альбому «HMR» гурта «марс-року» «IQ48».**

HMR — абрэвіятура ад Heavy Metal Rock. Менавіта так напрыканцы 1980-х — пачатку 1990-х гадоў XX стагоддзя «прасунутая» моладзь азначала практычна ўсю больш-менш цяжкую рок-музыку, не толькі метал у яго кананічным выглядзе. Якраз тады сфармаваўся музычны і жыццёвы светапогляд хлопцаў з «IQ48», а таксама пабачылі свет культавыя музычныя альбомы, якія змянілі эпоху і людзей. Такім чынам, «HMR» — даніна павагі тым часам і той музыцы, так мовіць, вяртанне да каранёў, ну і, канешне, самаіронія.

«HMR» складзены з 10 рок-баевікоў аўтарства «IQ48» і аднаго сумеснага трэку «Дай сілы!» з вядомым беларускім рэперам Vinsent'ам.




Гэта песні-развагі гарадскога хлопца пра кар'ерызм, мас-медыя, эміграцыю, самаідэнтыфікацыю сябе ў «каменных мінскіх джунглях» і ўвогуле пад сонцам. Ну і, канешне, адвечныя любоў і каханне.

Увесь альбом, ад напісання першай песні да апошняй рэкард-сесіі, быў створаны ўсяго за адзін год! Непасрэдна запіс «HMR» адбыўся ў чэрвені-верасні 2011 года на ўласнай студыі «Таксафон» гітарыста «IQ48» Паўла Яноўскага.

«HMR» запісаны адноўленым складам гурта «IQ48». Замест былога саксафону тут удзельнічае гітара Паўла Яноўскага (ён жа выступіў і ў ролі саўндпрадзюсара альбому), а за бас адказвае былы ўдзельнік гуртоў «Крамбамбуля» і «ZET» Улад Плюшчаў. Канцэпцыю вокладкі «IQ48» распрацавалі цалкам самастойна, а непасрэдна ажыццявіў гэтыя дызайн-ідэі яшчэ адзін гітарыст гурта Яўген Бузоўскі.

Цікава, што ў адной з кампазіцыяў альбома «HMR» упершыню на Беларусі выкарыстаны экзатычны музычны інструмент — вамола.

Рэліз альбому «HMR» адбудзецца 4 лістапада на музычных лэйблах «БМА» і «Vigma». Продаж першых асобнікаў будзе ажыццяўляцца непасрэдна на прэзентацыі «HMR», а потым у музычных крамах горада.

Прэзентацыя альбому «HMR» пройдзе 4 лістапада ў мінскім клубе «Re:Public» (вул. Прытыцкага, 62) пры падтрымцы гурта «Разбітае сэрца пацана», а таксама «зорных» гасцей.

Кошт квіткоў: першыя 100 — 35 000, астатнія — 40 000, у дзень канцэрту — 45 000, столікі — 55 000. Пачатак мерапрыемства а 19 гадзіне.

Даведкі па тэлефоне +375 29 649 08 88, +375 17 310 31 42.

▸ ДАБРАЧЫННАСЦЬ

# ЯНЫ ВАС ЧАКАЮЦЬ!

**Муха — абаяльная дзяўчынка, вельмі жыццярадасная і кантактная**



Мушцы каля годзіка, яна стэрылізаваная, ростам каля 45 см. Добрая ахоўніца. Ладзіць з дзецьмі, забаўная сяброўка для гульняў. Яна прызвычаеная да жыцця ў двары, таму пасуе для прыватнага дому.

Тэлефануйце, і Мушка будзе вам удзячнае ўсё сваё жыццё!

8-029-5024185 Кацярына

**Леапольд — вельмі ласкавы і сімпатычны**



Ён бясконца любіць гуляцца і смачна есці, добра ладзіць з іншымі коцікамі. А яшчэ Леа ўмее рабіць масаж! Кацянё вельмі выхаванае, цудоўна ведае, што такое латочак. Гэтаму сонейку ўсяго 2,5 месяца, і ён вельмі жадае сагрэць ваш дом!

Тэлефануйце! 8-029-554-64-11 Алеся

***

Усе гадаванцы — у падарунак.

Болей котак і сабак — у каталогах на www.forum.superkot.com

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1061

Падпісана да друку 14.10.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.